Пусцее вёска ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

РАССПЯВАНЫ ГАРАДОК ☞ 8

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 17 (2502) Год XLIX | Беласток, 25 красавіка 2004 г. | Цана 2,00 зл.

Юры Туронку — 75

Беларускай гістарыяграфіі ў Беларусі і Польшчы, але і беларусаведаў ва ўсім свеце, нельга сёння ўявіць без асобы Юры Туронка. 26 красавіка гэтага года спадару Туронку спаўняецца 75 гадоў. Віншуем! Ягоныя фундаментальныя працы і артыкулы, прысвечаныя навейшай беларускай гісторыі адкрывюць праўду пра такіх нас, якімі мы ў сапраўднасці. І давялося нам у дадатак жыць у гарачым геапалітычным пункце — Сярэдне-Усходняй Еўропе. Гутарку з Юбілярам праводзім мы ў ягоным аазісе спакою — прыгожым драўляным доміку, што ў Трыпуцях пад Беластокам.

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Зінаіда і Юры Туронкі з унукам Аленам

— Спадар Юры, дзе знаходзіцца Ваша Малая Айчына, тут на Беласточчыне, на Віленшчыне, а мо ў Варшаве дзе Вы працавалі?

— О! Цікава. Нарадзіўся я ў Дукштах, што на чыгуначнай дарозе Вільня — Дзвінск. Але для мяне гэта аніякая айчына; ані бацька, ані маці адтуль не выводзіліся. Бацька паходзіў з Дзісненшчыны і пасля заканчэння медыцыны ў Вільні быў накіраваны на працу ў Дукшты. А маці была родам адсюль, з Рушчан побач Харошчы. Проста ў мяне няма сантыменту да Дукштаў — бачу іх толькі як месца нараджэння. Дарэчы, куплены там бацькам дом згарэў у 1944 годзе. Не было ў мяне Малой Айчыны. Справы ідэйнага выбару разглядаю праз прызму Беларусь — Польшча.

— Ваша пакаленне дасведчыла жаху двух таталітарызмаў — фашызму і камунізму. На колькі спадарожнічаў Вам страх пры ўваходзе ў дарослае жыццё?

— Тады я не адчуваў аніякага страху, толькі цікавасць як змяняліся рэжымы, арміі, уніформы. У сваёй дзейнасці былі яны аднолькавыя. У 1936-39 гадах я вучыўся ў польскай школе, але пасля кастрычніка 1939 г. тут ужо з'явілася літоўская школа і, нягледзячы на пазнейшыя змены ўладаў ці ідэалагічных сістэмаў, увесь час працягвалася літуанізацыя жыцця. Я сам у гэтай школе літоўскую мову вывучыў на працягу трох месяцаў. І сёння яшчэ памятаю словы славутых савецкіх песняў такіх як „Три танкиста" ці „ Если завтра война", але па-літоўску, а не па-руску. Школа ўвесь час была літоўскай — змяняліся толькі партрэты. Але ў тым жа самім часе перад выбухам нямецка-савецкай вайны тэрор з боку саветаў у дачыненні да літоўцаў быў страшны. Арышты, ссылкі, расстрэлы, самагубствы былі штодзённасцю. Як тады, перад вачыма паўстае вобраз звычайнай жанчыны, якая роспачна ўголас малілася на нашай вуліцы: „Божа, сашлі вайну". Не важна хто меў прыйсці — немцы, англічане, французы — абы толькі зніклі савецкія акупанты.

— Ці між іншым жахлівыя вобразы вайны паўплывалі на тое, што Вы прысвяцілі сябе таксама і гісторыі, асабліва яе ваеннаму перыяду?

— Гэта складанае пытанне. Думаў я над ім не адзін раз. Уявіце сабе, што з верасня 1939 г. па ліпень 1944 г. хіба з пяць ці шэсць разоў змяніліся акупацыўныя рэжымы там дзе я пражываў. Пражытага мною акупацыйнага досведу я потым не знайшоў у савецкай гістарыяграфіі. Там усё было чорнае або белае. Найважнейшым аднак стымулам для мяне было даследаванне нацыянальнай свядомасці і нацыянальнай беларускай ідэі сярод беларускага насельніцтва, якому прыйшлося выносіць цяжкія выпрабаванні з боку польскай, савецкай, нямецкай уладаў. Я не быў ані дня на тадышняй акупаванай Беларусі. У гэтым часе жыў і вучыўся ў Вільні. Але і сёння не магу чытаць хлусні наконт тадышняй складанай палітычнай сітуацыі, у якой апынуліся беларускія эліты і наш народ. Я лічу, што I і II сусветныя войны зрабілі велізарны ўплыў на фарміраванне беларускай свядомасці насельніцтва. На жаль, перыяд другой сусветнай вайны я называю часам нашай грамадзянскай вайны. З-за палітычных розніц дзесяткі тысяч беларусаў ваявалі па двух баках барыкады. Знішчаліся ўзаемна і гінулі.

— Вы зараз напэўна надалей працуеце над выясненнем новых фактаў з гэтага перыяду?

— Маю такі намер. Зараз займаюся паясненнем спраў звязаных з вельмі важнай у час акупацыі арганізацыяй, а менавіта Саюзам беларускай моладзі. Асабліва мяне цікавіць яе дзейнасць у Нямеччыне, паколькі тое чым яна займалася ў акупаванай Беларусі збольшага ўжо адкрыта. Хацеў бы вось у бліжэйшы час апублікаваць кніжку, у якой апынуліся б матэрыялы прысвечаныя СБМ не толькі мае, але і іншых аўтараў. Бог дасць, дажывём.

— Але ці Вам, як гісторыку, не здаецца з сённяшняй перспектывы, што лёс беларускай дзяржаўнасці надалей у многім упісаны ў шахматы паміж Масквой і Берлінам?

— На маю думку берлінскі фактар зараз нашмат меншы. Заходнія саюзнікі вельмі ахвотна беларускія справы аддалі б Маскве. Дзеля парадку на ўсходзе. Аднак не трэба забывацца пра змены, якія адбыліся ў беларускім грамадстве ў XX стагоддзі. Беларускі народ павінен сам вызначыць свае арыенціры. Важны тут момант як складуцца суадносіны ў трохкутніку Беларусь — Расія — Украіна.

— А што ў такім выпадку з беларускай мовай...

— Я не веру, што без мовы можна будаваць сваю дзяржаўнасць. Прападае мова, мінае 25 гадоў і з нацыянальнай справай самае горшае. Дайце глянем зараз на праваслаўную Беласточчыну, дзе яшчэ яна захоўваецца. Але сто гадоў таму з Сакольшчыны выйшлі дзесяткі беларускіх каталіцкіх ксяндзоў і беларускіх палітычных дзеячаў. Але ўсё беларускае там ужо спаланізаванае. Тое ж адбываецца зараз і на праваслаўнай частцы. Калі нічога не зменіцца, то яшчэ адно, два пакаленні — мо крыху даўжэй. Сумная праўда, але трэба яе гаварыць. Апраўдацца з гісторыі нельга.

— Дзякуем за гістарычны ўрок.

Гутарыў Яўген Вапа

Балканскі жах ☞ 2

Аляксандр Вярбіцкі

Паводле сербскіх падлікаў у Косаве за час апошняй вайны было пашкоджана 208 сербскіх і візантыйскіх ды 116 албанскіх і турэцкіх помнікаў даўніны, падлягаючых ахове законам, з чаго цалкам разбураны 52 сербскія, два албанскія і тры турэцкія; паводле касавараў пашкоджана 225 мячэцяў...

Добрая навіна ☞ 2

Сакрат Яновіч

А царква — нязменна дзяржаўная — расейская; на Беласточчыне недалёкі той час, калі зробіцца яна дзяржаўна-паланізатарскай; у сем'ях большасці „бацюшкоў" пануе польскае слова, і толькі польскае. Беларускіх патрыётаў сярод іх — маргінэс. А здавалася б, тыя самыя людзі і тая ж раса...

Наступныя пакаленні ☞ 4

Хадайнічаем, у рамках Саюза гмін Кнышынскай пушчы, за адкрыццё ў Крынках пагранперахода ў Малую Бераставіцу. Нашым захадам вельмі садзейнічае пасол Беларусі ў Польшчы Павел Латушка, які да Крынак ставіцца вельмі цёпла, нават з сантыментам. Горш справа маецца з польскімі чынамі...

Візы ў цукры ☞ 5

Мацей Халадоўскі

Ні палякі, ні беларусы ў палове красавіка не хацелі сказаць колькі будуць каштаваць цыгарэты „North Star" ці „LM", самыя папулярныя базарныя тытунёвыя вырабы. Сёння можна было заплаціць адпаведна 2,50 і 3 злотых. Тое, на колькі ўзрасце іхная цана, залежыць ад таго, колькі каштаваць яны будуць у афіцыйным гандлі...

Спяваюць 50 гадоў ☞ 8-9

Міра Лукша

8 сакавіка ансамбль беларускай песні „Расспяваны Гарадок" адзначыў 50 гадоў свае дзейнасці. Праз „Расспяваны Гарадок" прайшло дзвесце асоб. Аб канцэртах, выступленнях і штодзённай рупнай працы гарадоцкіх самадзейнікаў можна напісаць кнігу. Яго заснавальніцамі былі Ніна Мушынская і Жэня Савіцкая, яе сястра, якая ў той час працавала бібліятэкаркай...

Пасябравалі ☞ 10

Аляксей Мароз

Вучням з Беларусі трэба было расказаць пра Гайнаўскі павет. Моладзь, якая вучыцца ў беларускіх школах, дзе руская мова з'яўляецца толькі дадатковым прадметам, размаўляла па-беларуску. На польскай мове адказвалі тыя вучні, якія дадаткова вучацца польскай мове...

9 770546 196000

Балканскі жах

Недзе ў палове сакавіка заманілася мне зазірнуць на газетныя сайты бліжняга замежжа, у тым ліку і сербскія. І асталася б гэтая заманка ў маім зацішку, калі б не фельетон Яўгена Мірановіча п.з. „Косава без сербаў" у 14 н-ры „Нівы". Пра шматлікія падзеі ў свеце мы атрымліваем вельмі скандэнсаваную сінтэтычную інфармацыю, да якой, не маючы магчымасці пабачыць грунт, з якога яна вырасла, ставімся паводле асабістых сімпатый да афарбоўкі голасу яе дыктараў. Таму хачу падкінуць крышку зачытаных мною сербскіх вытрымак на сербска-косаўскую тэму.

Жарка Корач у „Vreme" піша пра застрэленага годам раней сербскага прэм'ера Зорана Джынджыча, у асобе якога „Сербія магла навярстаць усё тое, што згубіла бязглуздай палітыкай і крывавымі войнамі, якія вяла цягам апошняга дзесяцігоддзя XX веку". А Радаслаў Стаянавіч у „Палітыцы" дадае: „На жаль, сербскія палітыкі часта забывалі пра людскія ахвяры дзеля іхніх палітычных мэтаў, якія яны аб'яўлялі нацыянальнымі". Дзе паны б'юцца, там мужыкам ілбы трашчаць. Спасылка на дзеянні сербскай ваеншчыны ў 1998-99 гг., — пішуць Мілан Мілошавіч і Ненад Стэпанавіч у „Vreme", — часта служыла пазнейшым адміністратарам Косава для апраўдання дзеянняў касаварскіх баевікоў, якіх лідэраў здаўна не бароніць недастатак доказаў перад адказнасцю за ваенныя злачынствы. Наступ аль-Каіды, занятасць НАТО ў Афганістане і Іраку ды мала аўтарытэтныя ўлады ў Бялградзе заахвоцілі касавараў вырашыць цішком тамашнія праблемы.

У выніку пагромаў 17 сакавіка г.г. загінула каля трыццаці сербаў, каля тысячы паранена, разбурана каля трыццаці цэркваў і манастыроў; найбольш у Прызрэне — восем, у іх ліку тры з XIV стагоддзя. Паводле сербскіх падлікаў у Косаве за час апошняй вайны было пашкоджана 208 сербскіх і візантыйскіх ды 116 албанскіх і турэцкіх помнікаў даўніны, падлягаючых ахове законам, з чаго цалкам разбураны 52 сербскія, два албанскія і тры турэцкія; паводле касавараў пашкоджана 225 мячэцяў. „Хаця Косава ў канцы васьмідзесятых гадоў сталі называць калыскай сербства, аднак — піша Тамара Скроза ў „Vreme", — нямнога грамадзян Сербіі магло назваць прынамсі пяць косаўскіх цэркваў". Няма тады дзіву, што і чужынцы, якія прыйшлі ў 1999 годзе, не надта даражылі імі. Але баланс знішчаных мастацкіх каштоўнасцей не абмежаваўся толькі да Косава: папрацавалі таксама жыхары Сербіі — у ноч з 17 на 18 сакавіка тлум спаліў мячэць Ісламагіна ў Нішу з 1720 года, не дапускаючы пажарнікаў, і мячэць Байраклі ў Бялградзе з другой паловы XVII стагоддзя — апошнюю з пятнаццаці, якія там пакінулі туркі. „У выніку здзічэння албанцаў і сербаў ды нядбайнасці і слепаце міжнародных арганізацый, незваротна прапала тое, што пакаленні таленавітых умельцаў пакінулі сваім наследнікам: веруючым ці атэістам, адукаваным ці невукам, праваслаўным ці мусульманам, сербам ці албанцам".

Шматвяковае турэцка-сербскае змаганне, — піша далей Тамара Скроза, — суправаджалася ўзаемным знішчаннем храмаў, аднак рэдка калі знішчаліся збудаванні, толькі прымяняліся кампрамісныя рашэнні: заваёўнікі збівалі старыя фрэскі і замянялі новай штукатуркай, ставілі або раскідалі мінарэты. Калі ў 1878 годзе ў Нішу сербы запатрабавалі ад туркаў, каб аддалі ім мячэць, тыя адказалі: „Ведаем з вопыту: каму Бог дасць уладу над Нішам, таму дасць і гэты дом для ягонай веры; бярыце яго!" Працягам трох дзён сакавіка 2004 года ў Косаве, Нішу і Бялградзе ніхто ад нікога нічога не патрабаваў — тыя, каму вышэйшая сіла дала ўладу, не пакарысталіся ёю, тыя, якія павінны верыць, веру даўно забылі. Аднолькава крывадушныя адны і другія, — заключае Тамара Скроза.

„Балканы па сутнасці з'яўляюцца чыстым жахам: калі іх пакінуць і аглянуцца, бачыцца нейкую катэгорыю падзення, вельмі дзіўнага, у бездань", — гэтую цытату з кнігі „Балканы як метафара" прыводзіць у „Vreme" Іван Міленкавіч.

Аляксандр Вярбіцкі

Добрая навіна



Нарэшце выйшла добрая кніжка пра беларускую і літоўскую нацыянальныя меншасці Польшчы! Не такая паліцэйская, як папярэднія. Маю на ўвазе акуратна адрэдагаваны том: *Cezary Żołędowski, Białorusini i Litwini w Polsce, Polacy na Białorusi i Litwie. Uwarunkowania współczesnych stosunków między większością i mniejszościami narodowymi*, wyd. Instytut Polityki Społecznej Uniwersytetu Warszawskiego.

Напісана зусім не па-польску эмацыйна, пераважае інфармацыйнасць, амаль энцыклапедычная. Прычым шмат выкарыстана беларускіх матэрыялаў — таксама беластоцкіх: Яўгена Мірановіча густа, Яна Чыквіна, Алега Латышонка, Андрэя Садоўскага, Уладзіміра Паўлючука, Яна Сычэўскага; Юркі Туронка асабліва шмат.

Хто такі Цэзары Жаландоўскі? Малады варшаўскі вучоны-палітолаг, аўтар ужо шэрагу кніжак прысвечаных міжэтнічным і міжнацыянальным суадносінам, галоўным чынам у Польшчы. Быў выкладчыкам ва Універсітэце Вашынгтона. Прымаў удзел у шматлікіх міжнародных сімпазіёнах у Еўропе і Амерыцы. Чалавек шырокіх гарызонтаў, без польска-нацыяналістычнай парафіяншчыны. Моцная ў ім схільнасць да еўра-пратэстанцкага аб'ектывізму. Не глядзіць на беларусаў і на іншыя малыя народы як асімілятар з ненавіснымі вачыма, што бывае ў тых вучоных, якія не пабачылі свету, сядзяць у катуху свайго хлява.

Зацікаўленне Жаландоўскага беларусамі і літоўцамі з'яўляецца вынікам яго глыбейшых зацікаўленняў гістарычнымі слядамі, што пакінула даўняя Рэч Паспалітая Абодвух Народаў. Адсюль інтрыгуючыя аналізы самаадчування беларусаў і літоўцаў у сутыкненні з польскай дзяржаўнай большасцю, і наадварот — самаадчуванне палякаў ды іх арганізацыйная рэакцыя як нацыянальных меншасцей Беларусі і Літвы. Эмацыйныя і рацыянальныя напружанні выяўляюцца рознымі. Вынікаюць яны перш за ўсё з укаранелай сярод палякаў памяці пра ўласную дзяржаўнасць, яе вялікія — каралеўскія! — традыцыі. Напружанасць з боку літоўцаў бярэцца з іхняй памяці пра незалежную Літву ў міжваенны перыяд ды непрыхільныя адносіны да яе тадышняй польскай палітыкі. Найцішэй паміж беларусамі і палякамі. Перш за ўсё таму, што ў беларускай памяці, гэтай гістарычнай, не існуе беларуская дзяржаўнасць. Дадаткова выроўнівае магчымыя этнічныя непаразуменні яшчэ і тое, што беларускія палякі ў сваёй масе нічым асаблівым не адрозніваюцца ад беларускай большасці, акрамя веравызнаўчых рысаў (напр. беларуская мова нярэдка ім, калі не роднай, то хатняй, сямейнай). Нешта падобнае цяпер наглядаецца і сярод польскіх беларусаў, у якіх курчыцца грамадская функцыя беларускай мовы, яе дыялектаў. Гэта відаць у першую чаргу ў асяроддзі маладых: значная частка іх нават свабодна валодае беларускай культурнай мовай і разам з тым не адчувае духоўнай патрэбы карыстацца ёю (у сяброўскім коле падсвядома пераключаецца на польскую, брат з братам, сястра з сястрою). Гэты псіхалагічны механізм універсальны, патрабуе асобных даследаў.

Гаворыцца, што беларусаў як нацыю выратоўвае праваслаўнасць іх родаў. Гэта так і не так. У нас тут каталіцтва, праўда, адназначна польскае, часамі ажно шавіністычнае. А ў Беларусі нешта адваротнае з ім якраз: усё часцей у касцёлах моляцца па-беларуску, і такая тэндэнцыя мацнее ў меру наплыву тутэйшых клірыкаў. А царква — нязменна дзяржаўная — расейская; на Беласточчыне недалёкі той час, калі зробіцца яна дзяржаўна-паланізатарскай; у сем'ях большасці „бацюшкоў" пануе польскае слова, і толькі польскае. Беларускіх патрыётаў сярод іх — маргінэс. А здавалася б, тыя самыя людзі і тая ж раса.

Нацыю фармуе лёс, такі і не іншы кавалак хлеба. Паланізуюць і каталічаць нас не ксяндзы з „бацюшкамі", але польскі бохан хлеба. Паўтараю: польскі лёс. Але гэта зноў асобная тэма дзеля даследаў.

На гэты конт Жаландоўскі не бярэ голас. Гэта мая, і толькі мая рэцэнзенцкая рэфлексія, чытаючы яго кніжку, салідна дакументаваную, без паліцэйскіх злосцяў на наша ў Польшчы ўсё трыванне.

Добрая кніжка не адно паглыбляе думкі, але і наклікае новыя.

Сакрат Яновіч

Вачыма еўрапейца

Аблітая Польшча

Сёлетні другі дзень Велікодных святаў правёў я дома. І не таму, што мне хацелася сядзець у хаце, а проста — баяўся выйсці на вуліцу. Ад самога ранку бачыў я са свайго балкона групы па больш за дзесяць падшыванцаў з вёдрамі, пластмасавымі бутэлькамі і чым яшчэ ўдалося, а ў чым маглі змясціцца вада і іншыя рознакаляровыя вадкасці. Традыцыйны *lany poniedziałek* ужо не першы раз пераўтварыўся — прынамсі на маім пасёлку — у жах. Адзін псіхолаг у тэлебачанні тлумачыў тыя „забавы" фрустрацыяй і няўдачамі не так саміх маладых людзей, як іхных бацькоў і атмасферай безнадзеі, якая штораз часцей спадарожнічае кожнаму дню жыцця ў блёкавішчах. З гэтай фрустрацыяй жыхары Польшчы ўвойдуць праз некалькі дзён у Еўрасаюз. Нічога не прадказвае таго, што будучы ўрад Марка Бэлькі ці Юзафа Алексага ўчыніць нейкія рэвалюцыйныя перамены ў грамадскім жыцці. Дарэчы, няма гарантыі, што 2 мая Лешак Мілер ажыццявіць сваё абяцанне і падасца ў адстаўку. Паколькі прафесар Бэлька мае цяжкасці са сфармаваннем свайго ўрада, а Юзаф Алексы меў бы не лепшую сітуацыю, Лешку Мілеру можа застацца прызнанне: „Не хачу, ды мушу!" і публічнае адрачэнне ад дадзенага публічна, у прысутнасці прэзідэнта Аляксандра Кваснеўскага, слова. А ж ніхто не сказаў, што магло б дайсці да роспуску парламента і аб'яўлення новых выбараў, хоць бы і ўвосень. Ну, СЛД ж не самагубца і адналічбавы ўзровень падтрымкі ў гэтых ранейшых выбарах пагражаў бы яму знікненнем з палітычнай сцэны, быццам калісьці АВС ці УВ. Так што можна спадзявацца чарговага „ліцця вады" перадавым актывам Саюза.

Калі я ў велікодны панядзелак забарыкадаваўся ў хаце, меў час глядзець тэлебачанне. Рана — як прароцтва нейкае — прагучалі тэксты ў адным фільме для моладзі. Галоўны герой, якога ролю іграў тады маладзенькі Матэвуш Даменцкі, называўся Янік. Вядома, не „той" Янік... Кшыштаф, а называлі яго там так, у адрозненне ад ягонага бацькі, таксама Яна. Момантамі дыялогі гучалі шматзначна. Адзін з герояў пытаўся ў другога: „Як думаеш, злачынца не можа называцца Янік?" У іншы момант герой з імем і прозвішчам былога омбудсмена — заступніка грамадзянскіх правоў — Тадэвуша Зялінскага так сказаў Яніку, у якога рэальнасць уварваліся персоны з камп'ютэрнай гульні „Лоўчы": „У наступным этапе можаш пазбегчы аблавы". На тое Янік: „А дзе выкрадальнікі?" Зялінскі: „Там, дзе іх найменш спадзяешся!"

Фільм здымалі ў 1993 г. Яго стваральнікам, пэўна, не прыйшло ў галаву, што іхны твор набярэцца іншага маштабу, кантэксту ну ніяк не камп'ютэрнай гульні, а выйдзе па-за выдуманы фабулярны анекдот. Аднак, у Польшчы здаўна так парабілася, што тое, што спярша здавалася быць нерэальным, было фільмавай ці літаратурнай фікцыяй, лёгка робіцца праўдай. Палітычная Польшча — непрадбачлівая, хутчэй непрадказальная, шалёна-бязглуздая, і фрустраваная. Так як тыя маладзёны, якія атакуюць любога, не пакідаючы на ім сухой ніткі. Каб адно я толькі, як у той аблівальны панядзелак, у дзень выбараў у польскі парламент не спалохаўся пайсці да выбарчай урны. Магу ж апасацца, што мой голас і так у Польшчы нічога не зменіць. А колькі нас так думае?

Мацей Халадоўскі

У гміне вялікае беспрацоўе. Раней людзі працавалі на чыгунцы, на дрэваапрацоўчым прадпрыемстве, але месцы працы былі ліквідаваны. Многа людзей звольнілі, калі закрывалі вайсковую часць. Вытворчы сельскагаспадарчы кааператыў вядзе гандаль толькі ў 2 крамах...

Пусцее нурэцкая вёска

Па дарозе ў Нурэц-Станцыю паабапал ваяводскай дарогі з Мілейчыч у Сямятычы адны пралескі. У вёсцы Жэрчычы красуецца вялікая мураваная царква, каля якой штогод затрымліваюцца паломнікі на Святую Гару Грабарку. Непадалёк вёскі нядаўна ўзнікла новая будоўля — ачышчальня сцёкаў. У Жэрчычах і Нурцы перавага мураваных дамоў.

Войт Нурэцкай гміны Раіса Пахвіцэвіч паясняе, што ачышчальню сцёкаў збудавалі ў 2003 годзе, праклалі каналізацыю ў Жэрчычах і частцы Нурца. Гмінныя ўлады разлічваюць атрымаць школьны аўтобус, купля якога будзе фінансавацца з дзяржаўнага бюджэту.

— Плануем да ліпеня 2004 года закончыць будову каналізацыі ў Нурцы. У першым этапе будовы мы выдаткавалі 3 317 тысяч злотых, з чаго 1 640 тысяч злотых склалі датацыі. Пракладка каналізацыі ў другім этапе жыхарам Нурца будзе каштаваць 2 194 тысячы злотых, але прадбачваем, што больш за палову сродкаў верне нам фонд SAPARD, — тлумачыць войт Раіса Пахвіцэвіч. — Зараз менш сродкаў на іншыя інвестыцыі. Ашчаднасці будзем рабіць там, дзе толькі магчыма. Перасталі нам кампенсаваць кошт асвятлення павятовых і ваяводскіх дарог і таму абмяжуем час іх асвятлення ноччу. Няма таксама рэфінансавання жыллёвых выдаткаў. Менш сродкаў будзе адведзеных на асветныя патрэбы.

Гміна Нурэц-Станцыя распаложана ў Сямятыцкім павеце на тэрыторыі 21 492 гектараў, але амаль палову яе (9 581 гектар) займаюць лясы і іх плошча павялічваецца, бо сяляне масава аблясяюць палі. У Нурцы і навакольных вёсках жыве 5 007 чалавек. У час апошняга перапісу 16% жыхароў дакляравала беларускую нацыянальнасць. Адна з жыхарак Жэрчыч паясніла, што большасць жыхароў гміны гэта людзі праваслаўнага веравызнання, але многія апасаліся назваць сябе інакш як палякамі. Хаця насельніцтва гміны хутка старэе, то яшчэ 540 вучняў займаецца ў падставовых школах і гімназіі, а 66 дзетак — у садку і нулявым класе ў Нурцы і Сяміхочах. У мінулым беларускай мове вучыліся ў падставовых школах ў Сяміхочах і Клюковічах. Зараз больш прыхільнасці да навучання ў школах мовы нацыянальнай меншасці, бо спрычыняецца гэта атрыманню дадатковых сродкаў на школы.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Раіса Пахвіцэвіч: Маладыя людзі рэгулярна выязджаюць і працуць у Бельгіі і іншых краінах Еўрасаюза. Калі вяртаюцца на адпачынак дамоў, на іх месца едуць сямейнікі.

— Мая сястра вучылася беларускай мове ў Клюковічах. Калі я пайшоў у школу, не было ўжо ў Клюковічах навучання роднай мовы. У пачатку дзевяностых гадоў ізноў дзеткі пачалі вучыцца па-беларуску і гэтае навучанне захавалася да закрыцця школы ў 1999 годзе. Яшчэ пакаленне нашых бацькоў арганізавала беларускія прадстаўленні. На Тройцу ладзілі ў Літвінавічах беларускія фэсты, на якія прыязджалі журналісты „Нівы". Добра было б арганізаваць у нашай гміне беларускі калектыў, — гаворыць выконваючы абавязкі дырэктара Гімназіі ў Нурцы Міраслаў Верхаў. — У наступным годзе хачу запрапанаваць бацькам навучанне мовы нацыянальнай меншасці.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Ачышчальню сцёкаў збудавалі ў 2003 годзе, праклалі каналізацыю ў Жэрчычах і частцы Нурца...

Цяпер у гміне вялікае беспрацоўе. Раней людзі працавалі на чыгунцы, на дрэваапрацоўчым прадпрыемстве, але месцы працы былі ліквідаваны. Многа людзей звольнілі, калі закрывалі вайсковую часць. Вытворчы сельскагаспадарчы кааператыў гандлюе толькі ў 2 крамах. Крыху людзей працуе ў прыватных крамах, некалькіх сталярнях і ў вытворцаў намагільных помнікаў. Самым вялікім работадаўцам з'яўляецца дрэваапрацоўчае прадпрыемства „Дрэвар", якое шмат вырабаў пастаўляе ў Нямеччыну.

— Маёнтак вайсковай часці нішчэе. Упраўляюць ім Вайсковае жыллёвае агенцтва і Агенцтва вайсковай маёмасці. Прадпрыемства ASPWOOD POLAND, якое ўзнікла на аснове тартака, абанкруцілася, — кажа войт Раіса Пахвіцэвіч. — Маладыя людзі рэгулярна выязджаюць і працуюць у Бельгіі і іншых краінах Еўрасаюза. Калі вяртаюцца на адпачынак дамоў, на іх месца едуць сямейнікі. Некаторыя асобы працуюць у Сямятычах. У Нурцы найбольш месцаў працы ў гміннай установе, надлясніцтве і школах. Некаторыя беспрацоўныя карыстаюцца фінансавай падтрымкай Гміннага асяродка сацыяльнай дапамогі.

Аб тым, што жыхары Нурэцкай гміны гасцінныя, пераканаліся тысячы праваслаўных паломнікаў, якія наведваюць Святую Гару Грабарку ў свята Праабражэння Гасподняга. У былой школе ў Грабарцы нядаўна быў заснаваны Праваслаўны асяродак міласэрнасці, які апякуецца пажылымі людзьмі. Паколькі ў гміне многа лясоў і прыгожых узгоркаў, улады заахвочваюць адкрываць агратурыстычныя кватэры і першыя крокі ў гэтай дзялянцы ўжо зроблены. Што ў Нурэцкай гміне можна добра адпачыць, пераканаліся жыхары Шлёнска, Варшавы ды іншых польскіх гарадоў. Сталі яны купляць танныя апусцелыя драўляныя хаты з участкамі, распаложанымі побач лясоў або прыгожых лугоў. Ва ўсходняй частцы гміны, мяжуючай з Беларуссю, лепшыя землі і там можна заўважыць, што маладыя развіваюць свае гаспадаркі. У Клюковічах пачалі вырошчваць больш агародніны і парэчак, а ў іншых вёсках — гадаваць кароў і свіней. Аднак у асноўным гаспадаркі тут размерам 5-10 гектараў. Многа зямлі ляжыць аблогам, бо дзеці павыязджалі ў гарады, а іхнім бацькам не пад сілу ўжо гаспадаранне.

— У вёсцы Вычулкі раней было 130 кароў, а зараз засталося іх толькі 20. Калі праязджаю праз нашы вёскі, сустракаю маладых людзей, якія застаюцца без працы. Некаторыя звыкліся са сваімі вёскамі і цяжка ім выехаць у гарады, каб там шукаць працу. Некаторыя працуюць толькі ў летнім сезоне, а пасля жыць дапамагаюць ім бацькі, — паясняе Міраслаў Верхаў.

— Я думаю, што трансфармацыя ў сельскай гаспадарцы будзе адбывацца яшчэ на працягу многіх гадоў. Зараз патрэбныя і меншыя гаспадаркі, хаця б з вытворчасцю агародніны. Перспектыва для гміны ў развіцці агратурыстычнай дзейнасці, — кажа войт Раіса Пахвіцэвіч, якая ўжо другую кадэнцыю кіруе гмінай.

Аляксей Мароз

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Падставовая школа і Гімназія ў Нурцы. Хаця насельніцтва гміны хутка старэе, то яшчэ 540 вучняў займаецца ў падставовых школах і гімназіі, а 66 дзетак — у садку і нулявым класе ў Нурцы і Сяміхочах...

Дуля з макам

28 сакавіка „Ніва” прыпомніла словы гімна „Мы выйдзем шчыльнымі радамі”. А мне прыпомнілася, што фрагмент гэтай песні „Браты, да шчасця мы падходзім” часта гучаў падчас нямецкай акупацыі, калі прэзідэнтам Беларускай цэнтральнай рады быў прафесар Радаслаў Астроўскі.

У 30-я гады беларусы спявалі „Ад веку мы спалі і нас разбудзілі”. Сёння прафесар Я. Мірановіч прыпамінае 25 Сакавіка — дзень узнікнення Беларускай Народнай Рэспублікі. Пра гэтую дату калісьці ніхто не ведаў. Я. Мірановіч піша таксама, што „калі адзін дырэктар саўгаса запрапанаваў беларусам вярнуцца ў каляровую клетку, большасць пакінула свабоду і права рашаць пра свой лёс”. Няўжо аўтар хоча, каб беларускі народ загнаць у клетку з шыльдай „Брусель” або „Масква”?

Да гэтай пары афёра гоніць афёру. Сеймавая спецыяльная камісія мела высветліць справу Рывіна. Атрымалася з гэтага дуля з макам і да таго за нашы, падаткаплацельшчыкаў, грошы. А тут раптам пачалася новая справа! Нехта дабіраецца да Владзімежа Цімашэвіча — міністра замежных спраў. Рэйтынг прэм’ер-міністра Лешка Мілера ўпаў зусім нізка, але ён сам пакуль не здаецца. Апазіцыйныя палітыкі арудуюць за новыя парламенцкія выбары. Усе хочуць зноў у Сейм. А каго ж будзем выбіраць? Зноў тых жа Алексых, Бароўскіх, Качынскіх, Тускаў, Лепэраў. На маю думку прэм’ерам павінен стаць Тадэвуш Дрозда, які стварыў бы „смеху варты” ўрад. Горш, пэўна, не было б, але весялей — напэўна.

Дзядзька Захар

Развалiны

Многія маладыя людзі з усходняй Беласточчыны, якія пасля вайны ў пошуках лепшага жыцця перасяліліся з вёсак у гарады, цяпер штораз часцей вяртаюцца на бацькаўшчыну. Рамантуюць яны хаты ды гаспадарчыя будынкі і, трэба сказаць, атрымліваецца гэта прыгожа. Але многія не заглядаюць на сваю бацькаўшчыну адкуль паўміралі іхныя бацькі.

У вёсцы Бялкі, што ў Нарваўскай гміне, ёсць забытыя сядзібы, дзе на хлявах паваліліся стрэхі, у хаце пабітыя вокны, а панадворкі пазарасталі пустазеллем і дрэвамі так, што ўлетку нават самому д’яблу цяжка туды прабіцца. Родныя дзеці і ўнукі не цікавяцца ні будынкамі, ні сядзібамі, не ведаю ці ўвогуле аплачваюць яны падаткі. На маю думку, такімі справамі павінны пацікавіцца самаўрадавыя ўлады і адміністрацыйна абавязаць дзяцей або ўнукаў да ўпарадкавання сядзіб і будынкаў сваіх бацькоў, каб яны сваім сумным выглядам не страшылі праязджаючых побач людзей. А калі радня адмовіцца — пераняць будынкі і сядзібы пад самаўрады ды прадаць гараджанам, якія хочуць пабудаваць дачу на вёсцы. Трэба шанаваць людзей, якія засталіся на вёсках і дбаць, каб нашы вёскі прыгажэлі з году ў год.

Мікалай Лук’янюк

Б. Панасюк: Горш справа маецца з польскімі чынамі, бо мы не маем выхаду ў нашы палітычныя вярхі і нашы хадайніцтвы не маюць прыхільнасці ні ў левым, ні ў правым лагеры...

Працуем на наступныя пакаленні

Гміна Крынкі атрымала званне Лідэра польскай экалогіі за 2003 год. Пра сакрэты гэтага ганаровага вылучэння спытаў я войта Багуслава Мар’яна ПАНАСЮКА.

— У мінулым годзе прайшоў VII выпуск гэтага агульнапольскага спаборніцтва вясковых гмін, ладжанага Міністэрствам аховы асяроддзя. З агульнага ліку каля тысячы шасцісот гмін у краіне да спаборнічання прыступіла восемдзесят.

— ***І многа было пераможцаў?***

— Толькі адзін — мы.

— ***За якія поспехі ваша гміна атрымала гэтае званне?***

— За апошнія гады мы многа інвеставалі ў ахову асяроддзя: некалькі дзесяткаў мільёнаў злотаў у 1996-2003 гг. За гэты кошт была пабудавана ачышчальня сцёкаў і каналізацыя ў самых Крынках, па вёсках пракладваліся водаправоды, былі мадэрнізаваны тры станцыі паляпшэння вады, праведзена замену вулічнага асвятлення з ртутных і жаравых лямп на натрыевыя; гэтая апошняя змена панізіла наша запатрабаванне на электраэнергію на 50%, дзякуючы чаму цяпер у кожнай, нават найменшай вёсцы, ноччу вуліцы асветлены. У школе і Гмінным асяродку культуры вугальныя печы замянілі мы печамі на біямасу — пілавінне. У будынкі Гміннай управы, асяродка здароўя і Дому настаўніка паставілі масленыя печы. Сярод дзяцей і моладзі ладзім экалагічныя конкурсы ў выніку якіх вярнулі мы каля пяцідзесяці тон сыравіны. Арганізуем таксама селектыўнае збіранне адкідаў.

За перамогу ў экалагічным спаборніцтве гміна атрымала ўзнагароду 200 тысяч злотаў. Сто тысяч злотаў узнагароды атрымалі мы з конкурсу „Наша гміна ў Еўропе”. Увогуле бюджэт нашай гміны парадку пяці мільёнаў злотых, уласныя грашовыя паступленні парадку аднаго мільёна.

— ***Націск на экалогію мо прыцягне турыстаў. Ці гміна адкрыта для турыстычнага бізнесу? Якая тут турыстычная база?***

— Пакуль у нас зацікаўленне турыстычным бізнесам невялікае, але турыстаў прыязджае шмат. Працуюць тры агратурыстычныя гаспадаркі: Зямкоўскіх у будынку былой школы ў Крушынянах, Маршалкаў у Лапічах і Сайкоў у Свідзялоўцы — яны разам прапануюць трыццаць месц; чацвёртая рыхтуецца ў Кундзічах. Летам арганізуецца турбаза ў нашай школе на дзесяць месц. Да гэтага ўсяго на тэрыторыі гміны ёсць палаткавыя ўчасткі для трохсот асоб.

Каля Крынак ёсць вадаём плошчаю ў 3,5 га, каля Крушынян вадаём з люстрам вады плошчаю ў 18,5 га часткова абведзены пляжам, ёсць прыватныя вадаёмы. Каля Саннік пабудавана назіральная вышка. Помнікам архітэктуры з’яўляецца планіроўка цэнтра Крынак Антона Тызенгаўза ды паслядворскі парк дэ Вір’ёна. У будучым годзе царква ў Крынках будзе адзначаць 500-годдзе; вартыя ўвагі цэрквы ў Юраўлянах і Грыбоўшчыне, касцёл у Крынках, мячэць і мізар у Крушынянах. У Крынках захавалася адна сінагога і тальмудычны дом, найбольшы ў рэгіёне кіркут.

— ***На пляцы ў цэнтры Крынак стаіць пабудова, прызначэння якой я не здагадваюся...***

— *Pergola?* Яна мела, мабыць, служыць фонам для адкрытай сцэны. Пасля вайны цэнтр Крынак быў зруйнаваны, завалены друзам і яго адбудове не заўсёды спадарожнічала суцэльная ідэя, напрыклад будынак гэсу закрыў від на гістарычную царкву. Мне бачыцца візія жывога цэнтра з аднапавярховымі будынкамі, дзе размясціўся б адміністрацыйна-культурны асяродак з глядзельнай залай і бібліятэкай, паліцыйным участкам, амбулаторыяй, гастраномамі, турыстычным офісам, стаянкамі для аўтамабіляў ды помнікам Антону Тызенгаўзу ў цэнтры. Візія мусіць быць, бо раней многае — водаправоды, каналізацыя — здаваліся немагчымымі мерапрыемствамі, але сёння яны ёсць! Улічваць трэба і новыя рэаліі: яўрэйскай гміне мы аддалі пляц на якім стаяла разбураная ў вайну сінагога. Сёння наш Гмінны асяродак культуры займае таксама будынак былой сінагогі, які таксама трэба будзе аддаць, а сам асяродак трэба ж будзе кудысь перанесці. Парадкуем вуліцы, думаем пра паляпшэнне дарог. З меркаваннем пра дарогі не можам, пакуль, зладзіцца з еўрасаюзнымі чыноўнікамі, якія не разумеюць нашых рэалій. Нам хопіць пакласці на нашы дарогі асфальтавае палатно шырынёю ўсяго ў тры метры, а яны патрабуюць шасці. Трымаючыся нашых палажэнняў мы маглі б пакласці дваццаць кіламетраў асфальту, а выконваючы еўрасаюзныя — 6-8 кіламетраў.

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

— ***А як у гміне выглядае гаспадарка, працаўладкаванне, беспрацоўе?***

— У апошніх гадах шмат фірмаў спыніла дзейнасць. Упала найбольшая гарбарня са 160 працоўнымі месцамі; асталося некалькі малых, дзе працуе каля трыццаці асоб. У пачатку 90-х гадоў разваліўся пэгээр з 550 працоўнымі месцамі. У 2001 годзе шпіталь пераўтвораны ў Апякунча-даглядчыцкі асяродак, у якім працуе 18 апякунак. У гмінных установах працуе каля ста чалавек, столькі ж і ў гэсе. Ёсць некалькі дзесяткаў гаспадароў, якія маюць за пяцьдзесят гектараў — яны займаюцца галоўным чынам пастаўкай раслінай прадукцыі. Восем гаспадароў спецыялізуецца ў вытворчасці малака. Беспрацоўе ў гміне на ўзроўні 23%, шмат нашых жыхароў апынулася на Захадзе. Дэмаграфічная структура такая, што ў самых Крынках пражывае тры тысячы чалавек, а ў апошніх мясцовасцях — тысяча. Наглядаецца вяртанне пенсіянераў, шмат людзей зацікаўленых купляй зямельных участкаў. У нас зацішна і спакойна, людзі тут ідэнтыфікавальныя.

— ***Прыляганне гміны да дзяржаўнай мяжы гэта плюс ці мінус?***

— Дзякуючы мяжы маем у Крынках Гранічную страж, якая ў нашых умовах запэўнівае жыхарам гміны бяспеку. Хадайнічаем, у рамках Саюза гмін Кнышынскай пушчы, за адкрыццё ў Крынках пагранперахода ў Малую Бераставіцу. Нашым захадам вельмі садзейнічае пасол Беларусі ў Польшчы Павел Латушка, які да Крынак ставіцца вельмі цёпла, нават з сантыментам. Горш справа маецца з польскімі чынамі, бо мы не маем выхаду ў нашы палітычныя вярхі і нашы хадайніцтвы не маюць прыхільнасці ні ў левым, ні ў правым лагеры. А пагранпераход у нас вельмі патрэбны, бо ж граніца раздзяліла шмат сем’яў, якія надалей утрымоўваюць з сабою сувязі, між іншым, многа маіх сямейнікаў жыве непасрэдна за мяжою. І не патрэбны тут вялікія капіталаўкладанні.

— ***Гісторыя абышлася з Крынкамі крышку каварна: мясцовасць абмінула нясучая цывілізацыйны прагрэс чыгунка, а вызначаная побач дзяржаўная мяжа паставіла горад — так сказаць — „пад сценку”. Як Вы бачыце будучыню?***

— У 2009 годзе будзем адзначаць 500-годдзе атрымання Крынкамі гарадскіх правоў. Ужо ў гэтым годзе думаем правесці першыя мерапрыемствы, прысвечаныя юбілею з удзелам каталіцкага і праваслаўнага іерархаў — хочам захаваць дух згоды ў гміне. І згаданы ў пачатку экалагічны высілак таксама скіраваны ў будучыню — мы мусім уцывілізаваць нешта наступным пакаленням нашай зямлі.

— ***Дзякую за размову і жадаю поспехаў у Вашых намаганнях.***

Гутарыў Аляксандр Вярбіцкі

Візы ў цукры?

На беластоцкіх базарах пасля ўваходу Польшчы ў Еўрасаюз цэны, несумненна, павысяцца. Так кажуць як польскія, так і беларускія гандляры.

Згодна з вызначэннямі міністраў замежных спраў Польшчы і Беларусі, з 1 мая значна паніжацца цэны віз. Аднаразовая мае каштаваць 5 еўра, шматразовая — 25 еўра.

— Ну, гэта ўжо штосьці, — кажа Света з Гродна, якую ўжо ад двух гадоў можна сустрэць на базары па вуліцы Юравецкай. Гандлюе цыгарэтамі і ўсім, чым удасца. Праз хвіліну дадае і пытаецца:

— Толькі чаму яны цану віз памяншаюць напалову? Чаму ж не спусціць яе да 1 еўра, альбо ўвогуле яе не адмяніць?

Больш скептычныя палякі, тыя гандлюючыя цыгарэтамі з Беларусі, што стаяць бліжэй да рэчкі Белай, значыць, у першую чаргу перахопліваючыя пакупнікоў, якія ўваходзяць на базар.

— Ну, і што з таго, што візы патаннеюць? Затое цэны абавязковых страховак скочаць! І то недзе ў тры разы! — скардзяцца хорам прадаўцы.

Малады мужчына мяркуе:

— Па-першае, даражэйшыя будуць страхоўкі, а, па-другое, цэны на цыгарэты ў Польшчы будуць высокія, такія, як у Еўрасаюзе. У нас яны таксама скочаць. Гэта без сумненняў.

Ні палякі, ні беларусы ў палове красавіка не хацелі сказаць колькі будуць каштаваць цыгарэты „North Star" ці „LM", самыя папулярныя базарныя тытунёвыя вырабы. Сёння можна было заплаціць адпаведна 2,50 і 3 злотых. Тое, на колькі ўзрасце іхная цана, залежыць ад таго, колькі каштаваць яны будуць у афіцыйным гандлі.

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

— На пачатку яны занадта не могуць падаражэць, каб не напалохаць пакупнікоў, — калькулюе малады паляк. Света, якая стаіць пару метраў ад яго, дакідае:

— Калі ў вас гарэлка будзе яшчэ таннейшая, як цяпер, не будзе выгады яе ад нас прывозіць хоць бы толькі з гэтае прычыны. Ну, але спірт, мабыць — будзе яшчэ нейкая выгада.

Паўлітра найтаннейшай гарэлкі ў польскай краме каштуе крыху больш за 14 злотых. На базарах актуальная яе цана — 10 зл. Ужо з гэтай прычыны попыт на яе на базарах панізіўся. Чатыры злотых танней, але ці ёсць гарантыя, што алкаголь не „хрышчаны"? Ці, значыцца, ад 1 мая будзе нейкая выгада гандляваць і беларусам, і палякам, якія да гэтай пары забяспечваліся на Беларусі? Можа... цукрам?

— Калі фактычна будзе ён у вас каштаваць з паўтара долара, то продаж нават пару кілаграмаў нашага цукру дасць прыбытак, прынамсі вернецца цана візы, — плануе Эдзік з Гродна, Свецін сябра.

Пакуль што, гандляры чакаюць. Падляшская часць Памежнай стражы надалей аптымістычна бачыць будучыню беларуска-польскага памежнага руху. Аднак на базары па Юравецкай прадбачваюць такое:

— У маі будзе тут пустэча.

Два тыдні да ўваходу Польшчы, Літвы і апошніх васьмі краін у ЕС можна было прыкмеціць на Юравецкай адно: цыгарэты купляліся блокамі. Большы рух быў таксама пры гандлюючых адзеннем. Да тэмы вернемся на пачатку мая.

(мах)

Бедныя паслы

Пад канец сакавіка г.г. па тэлебачанні пачуў я інфармацыю, што многія паслы пішуць прашэнні ў канцылярыю Сейма, каб атрымаць сацыяльную дапамогу. І атрымліваюць яе, бо... не хапае ім грошай пражыць з пасольскіх сутачных. У перадачы гаварылася таксама аб тым, што ў маршалка Сейма ляжыць ужо гатовы праект закона, на які згадзіліся ўсе опцыі, паводле якога пасол, які прабудзе хоць адну кадэнцыю, а на другі тэрмін не будзе абраны, атрымае пастаянную пенсію велічынёю 1 100 зл. Вядучы тэлеперадачу дадаў, што падаткаплацельшчыкі наложаць сабе на шыю яшчэ дадатковы хамут, каб утрымаць былых паслоў.

Ці сапраўды паслы маюць такія вялікія страўнікі, што на працягу чатырох гадоў выціраючы сваімі азадкамі сеймавыя крэслы, атрымліваюць так вялікія грошы? А тым часам рабочы ці селянін, які прапрацаваў трыццаць і больш гадоў задаволіцца на старыя гады пенсіяй велічынёю 600 зл. і не будзе ведаць як звесці канцы з канцамі. Што з таго, што нейкая газета апіша аб гэтым усім, або хто-небудзь скажа проста ў вочы паслам праўду. Паслы гэтага не саромяцца, а нават у вочы могуць сказаць: „Не сунь свайго свінскага рыла ў дэпутацкі агарод". І гэта праўда, бо бедны народ не ў змозе супрацівіцца сеймавым законам, а паслы зробяць сваё. Пры галасаванні не будзе ні левых, ні правых, ні лібералаў — аднагалосна пяройдзе выгадны паслам закон, а мы, падаткаплацельшчыкі, толькі будзем плаціць.

Апамятайцеся шаноўныя паны паслы і сенатары, не трактуйце дзяржаву як „дойную карову"!

Мікалай Лук'янюк

Адданы „Ніве"

Кожны раз, калі адкрываю новы нумар „Нівы", шукаю на старонках допісаў Мікалая Лук'янюка і прагна іх чытаю. Гэты чалавек сэрцам і душою адданы нашым беларускім справам. Ён шукальнік праўды і кляймуе кожнае, якое б ні было, зло. Такі чалавек родзіцца адзін на тысячу, а мо і яшчэ радзей. Мікалай Лук'янюк з'яўляецца адданым карэспандэнтам „Нівы", самародным паэтам і зоркім назіральнікам добрых і дрэнных учынкаў і з'яў, ад яго пільнага вока нічога не схаваецца. І піша ён у „Ніву", каб свет убачыў, якія мы людзі, якія нашы валадары, што нас акружае, якія ў нас думкі і рэфлексіі. Восенню мінулага года мяне і жонку прыбіла вестка пра заўчасную смерць ягонага сына, бо ж гэта страшэннае гора хаваць сваіх дзяцей. Шмат хто ў такіх абставінах апусціў бы рукі, але ён не спыніў сваёй высакароднай дзейнасці і прадаўжае яе, мо часта паліваючы слязамі старонкі сваіх допісаў. І гэта з'яўляецца чарговым доказам ягонай сілы волі, выдатнага характару і высокіх маральных якасцей. Я за гэта з вялікай пашанай кланяюся Мікалаю Лук'янюку і ягонай жонцы.

Мікалай Панфілюк

Я тут шэф!

Водная суполка „Кляшчэлі" арганізавалася ў 1956-1964 гадах, калі праводзілася меліярацыя на Гайнаўшчыне. Мела сачыць за належным утрыманнем меліярацыйных установак. Сяляне за паслугу плацілі ўзносы. Суполкай кіравала праўленне, а важнейшыя справы рашаліся на агульным гадавым сходзе. Паколькі на бягучыя справы не хапала грошай, дык суполка атрымоўвала дзяржаўныя датацыі. Але і гэтых не хапала, каб утрымаць у належным стане ўсю плошчу меліяраваных сенажацей, пабудову водапрапускных труб на равах. Устаноўкі з цягам часу пазарасталі кустамі ды ў час дажджавога надвор'я не адводзілі ваду, а ў час засухі не наваднялі лугоў. Сяляне ў далейшым абавязаны плаціць складчыны.

Міхасю Бішчуку з Кузавы бацька перапісаў 1,62 га сенажацей ва ўрочышчы „Пухава". У час камасацыі грунтаў, якая праходзіла ў Кляшчэлеўскай гміне ў 1997 годзе, селяніну назначылі ўчастак непадалёк чыгуначнай станцыі ў паменшанай плошчы 1,27 га. Да 2002 года гаспадару не прысылалі плацёжных патрабаванняў за кансервацыю меліярацыйных установак. Першую павестку Міхась Бішчук атрымаў у верасні 2002 года, у якой напаміналася аб заплаце складчыны за 2002 год і нядоімкі за 1999-2001 гг. Не разумеючы адкуль „нядоімкі", паехаў ён у Кляшчэлі высветліць справу. Сакратар суполкі абышоўся з просьбітам няветліва. Трэці ўжо год Міхась Бішчук водзіцца з Кляшчэлеўскай воднай суполкай быццам кошка з мышкай. Чыноўнік Сяргей Галёнка штогод пасылае напаміны аб нядоімках, а селянін тлумачыць (пісьмова ў форме заяў і прашэнняў), што за 1999-2001 гады плаціць не будзе паколькі равы не былі расчышчаны і сенажаці знаходзіліся пад вадою. Так і зараз справа маецца, што праверыў ён асабіста 22 сакавіка. Патрабаваў паклікаць камісію з удзелам прадстаўніка гміннага самаўрада і павятовага староства з Гайнаўкі. Мала таго, селянін заявіў, што як у фінансавай дакументацыі, так і пісьмовай угледзеў недапушчальныя памылкі, аб чым паведаміў сакратару Гміннай управы ў Кляшчэлях. Прысутны ў час размовы працаўнік сельскагаспадарчай службы сканстатаваў: „Скажыце спадару Галёнку, няхай паправіць дакументы, бо справай можа нехта іншы пацікавіцца". Калі Міхась Бішчук сказаў Сяргею Галёнку, што пачуў у гміне, дык гэты груба заявіў: „G.... mnie to obchodzi, co mówią w gminie. Ja tu jestem szefem". І так кузаўскі пенсіянер з хворай нагою (пасля выпадку) пашлёпаў дамоў ні з чым. Не даручыў чыноўніку чарговай заявы (гэты адмовіўся прыняць), але копію паслаў у Павятовае староства. Які будзе вынік, пакажа час.

Уладзімір Сідарук

Яшчэ пра музей

Наталля Герасімюк („Ніва", ад 1.02.2004 г.) звярнулася да беларусаў, між іншым, з пытаннем „як удыхнуць жыццё" ў велізарны будынак музея. Помню палеміку на старонках „Нівы", звязаную з пабудовай беларускага музея ў пачатку, бадай, васьмідзесятых гадоў мінулага стагоддзя. Цяпер ставіцца пытанне, што зрабіць з такім агромністым будынкам, калі тады было вядома, што ў Гайнаўцы няма каму прафесійна весці музейную ўстанову. Каб гэта прадбачыць, не трэба было выказвацца вялікай пранізлівасцю. Калі так, дык можна сказаць, што калі наварылі такога піва, дык піце, таварышы, яго самі. Шкада толькі тысяч долараў ахвяравальнікаў з усяго свету, пры дапамозе якіх паўстаў „даўгабуд". Дзесяцігоддзямі „Ніва" друкуе спісак ахвяравальнікаў, але ні разу не ўдалося мне прачытаць, як былі расходаваныя гэтыя, як не кажы, але грамадскія грошы. Пішу пра гэта, бо калі чытаю ў допісе Юркі Харкевіча „Якім быць музею ў Гайнаўцы" пра фінансавы балаган, дык не дзіўна, што „гэта ўсё не стварала добрай атмасферы вакол Музея". Ю. Харкевіч піша далей, што „будуючы забыліся — мы ўсе — пра яго ідэю". Не ўсе, спадар Харкевіч, не ўсе. І яшчэ адна праўда, якую трэба сабе ўсведаміць: ніколі вялікі будынак Беларускага музея не будзе цэнтрам культуры беларускай меншасці. Чаму? — часткова на гэтае пытанне адказвае аўтар допісу. Каб у Беластоку, пэўна так, хаця толькі 7 434 жыхары горада прызналіся да беларускасці, але патэнцыял куды большы чым у Гайнаўцы, ну і кадры, якія ўсё вырашаюць, як нехта казаў.

Некалькі дзён таму аглядаў я старонку www.hajnowka.pl у Інтэрнэце і пра беларускі музей ёсць там адзін сказ, што такі існуе. Нічога пра беларусаў, беларускасць, культуру, адметнасць рэгіёна і г.д.

А так пры нагодзе, спадар Харкевіч, думка, каб пры Музеі заснаваць эстраду, гэта ўжо зусім кур'ёз. Хіба, што музейную. З тым згаджаюся. Музейных эстраднікаў не так ужо і мала.

Міхась Куптэль

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Аўгустова

Беласток

Рыбалы

Урок беларускай мовы

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Бельск-Падляшскі

Вершы Віктара Шведа

Зіма кароценькая ў нас

Скардзіцца ў школе вучань Валерык:
— Не маем ваннай у нашай кватэры.
— А дзе вы купаецеся ў сваім доме?
— У рэчцы купаемся ўсе мы, вядома.

А дзеці пытаюць пачуўшы такое:
— А дзе ж вы купаецеся зімою?
Валерык са шчырасцю ім паясняе:
— А колькі ж цяпер зімы гэтай маем!

Чаму бусел даўганогі?

Пачула маці ад малога:
— Чаму бусел даўганогі?
Смешны надзвычай гэты птах,
Быццам ідзе на хадулях.

Паясняе гэта мама
Надта цікаўнаму Адаму:
— Каб па зямлі ён немаўлят
Не валок да нашых хат.

Вясёлы куточак

— Што тут дзеецца? — пытае маці сынка, які залез на шафу.

— Гуляем з дзедкам у амбулаторыю.

— Не разумею...

— Дзедка з'яўляецца лекарам і выслаў мяне для лячэння ў горы.

* * *

Бабуля просіць унучка каб правёў яе на аўтобус.

— Не магу, — адказвае малы.

— Чаму?

— Бо тата сказаў маме, каб падала вячэру зараз пасля твайго адыходу.

Даслаў Андрэй Гаўрылюк

* * *

Тое, што дарагое,
Тое, што добрае,
Тое, для чаго варта жыць,
Тое, што...
Дом, поле, вёска.
Наша жыццё.
Тое, што пішу
Не для ўсіх
Толькі для людзей.
Для жыцця.

* * *

Мая вёска
У кветках.
Кожны дом
Для ўсіх.
Ды ўсе госці.
Вёска не малая,
Не вялікая.
Наша.

Аня Артэмюк, ПШ у Аўгустове

Фламенка ведае ўвесь свет!

У нашай школе кожны год ладзяць Еўрапейскі дзень. Вучні пасобных класаў рыхтуюць кароткія сцэнкі звязаныя з адной з краін Еўрасаюза. У гэтым годзе, у выніку жараб'ёўкі, нам трапілася Іспанія. Гэта, паводле мяне, вельмі цікавая краіна для такіх мерапрыемстваў. Вучні прыдумалі канкурэнцыі і рыхтаваліся тры тыдні. Нам трэба было падрыхтаваць народны танец і мы, вядома, падумалі пра фламенка. Фламенка ведае ўвесь свет і няма патрэбы тут шырэй распісвацца. З нашага класа танцавала восем асоб: я, Оля, Эмілія, Каміля, Мартына, Марлена, Мацвей і Марыюш. Танца навучыла нас цёця Эмількі. Усёй публіцы наш танец падабаўся, дзяўчаты іграли на кастаньетах, мелі доўгія спадніцы і вееры, а наш сябра Алесь, які сам падобны на іспанца — іграў на гітары.

Сябры з іншых класаў таксама паказалі народныя танцы. Клас ад Францыі танцаваў канкан, ад Чэхіі — польку, ад Аўстрыі — вальс, ад Грэцыі — зорбу. А ад Венгрыі быў чардаш.

Мы таксама частавалі камісію і публіку іспанскімі стравамі, расказвалі пра культуру і гісторыю ды ўсе важнейшыя месцы паказвалі на вялікай карце Іспаніі.

Вучням падабаўся гэты дзень таму, што гэта быў апошні дзень перад Велікоднымі канікуламі.

(нак-с), V кл. ПШ н-р 4 у Беластоку

Дубы

Яны стаялі пры ўездзе ў вёску, на поплаве, трохі ў баку ад дарогі. Стаялі купкаю адзін пры адным — усе тры рослыя, тоўстыя, галлістыя. І калі б я ні вяртаўся дадому — бачыў яшчэ здалёку іх непакорныя, пышныя вяршаліны. Сэрца маё адразу ж напаўнялася радасцю — пройдзе некалькі хвілін, і буду я ў сваёй знаёмай змалку хаце, сярод усяго такога звыклага, роднага, быццам я ніколі нікуды і не выязджаў.

Самыя розныя ўспаміны ажывалі раптам. Пад дубамі мы, вясковыя хлапчукі, як толькі мінала доўгая, халодная зіма, раставаў снег, зелянеў поплаў, пасвілі свіней, раскладвалі вогнішчы, пяклі пячонікі, ляжалі ў цяньку, уставіўшыся вачыма ў бяскрайні блакіт неба, думаючы, марачы кожны пра сваё. Дубы не маўчалі, шумелі лісцем, асабліва калі блізка была навальніца, шумеў дождж. Шумелі па-рознаму, то ціха, спаважна, то глуха, трывожна — гледзячы якое было надвор'е, адкуль і як дзьмуў вецер.

— Нешта дубы разгаманіліся, — казалі ў нашай вёсцы і пазіралі на неба: ці не набліжаецца чорная хмара, навальніца?

Ляцелі з лесу ці ў лес птушкі — прысядалі адпачыць на дубах. Затрымліваўся, не мінаў дубоў і калашмайвецер, падоўгу гушкаўся ў галінах. Восенню, калі жаўцелі палі, прастарнелі лугі, вецер атрасаў з дубоў спачатку жалуды, а потым і лісце. Паднімаешся раненька з пасцелі, прыбяжыш пад дубы, а там — услана жалудамі. Поўнымі, спелымі, нейкімі прадаўгаватымі, як кулі...

З усяе вёскі бывалі ў такую пару пад дубамі людзі. Прыходзілі не толькі збіраць жалуды, але і нанізваць на пруцікі сухое калянае лісце. На лісці, усцілаючы імі спод печы, пяклі ў нашай вёсцы хлеб. Дубовае лісце з усімі яго пражылкамі прыгожа адбівалася на ніжняй скарынцы бохана, і скарынка была вельмі смачная.

Па дубах, па тым, як яны распускаліся, выкідвалі зялёнае полымя жыцця, вясною гаспадары і гаспадыні меркавалі, што ўжо можна, а чаго нельга сеяць і садзіць у агародах. Бо дубы — гэта не бярэзнік, не асіннік і нават не алешнік: яны ніколі не памыляліся, чулі, надзейна чулі, павярнула на цяпло ці ўсё яшчэ будзе стаяць на холадзе...

Словам, дубы належалі вёсцы, да іх усе прывыклі, і нават уявіць сабе было цяжка, як можа быць вёска без такой красы — дубоў...

Барыс Сачанка

Святочныя пажаданні ад нашых чытачоў і аўтараў

Адмірал і яго каманда

Махаон

Махаон — адзін з самых вядомых і вялікіх матылькоў, што сустракаюцца ў Беларусі. Размах яго крылаў дасягае 9 сантыметраў. А падобны ён на сонечнага зайчыка, які весела скача над лясными палянамі, узлескамі, лугамі, дзе водзяць карагоды кветкі.

Калісьці ў некаторых мясцовасцях, расказваў мне сябар мастак, гэтага матылька яшчэ называлі гусарыкам. Бо надта ж фацэтна выглядаюць на яго задніх залаціста-чорных крылах доўгія вузкія хвосцікі, падобныя на шпоры ў ботах колішніх гусараў. Мабыць, яны сапраўды дапамагаюць прыгажуну імкліва лётаць — толькі паспявай сачыць за ім вачыма.

Не так даўно махаон быў даволі шматлікі, нават паблізу ад вялікіх гарадоў, аб чым усцешана паведамлялася ў газетах і навуковых кнігах. Аднак сёння, калі я пішу пра яго, матылёк нерухома глядзіць на мяне з малюнка на старонцы сумна вядомай Чырвонай кнігі.

Значыць, па-ранейшаму штосьці не так у нашых стасунках з прыродай. І страшна падумаць: няўжо неўзабаве наступіць дзень, калі наша зямля застанецца без жывога сонечнага зайчыка?

Уладзімір Ягоўдзік

* * *

Дрыжыць у лісцях стылы ранак,
Знікае прыхамаць дажджоў,
На правады сухіх маланак
Садзяцца ластаўкі ужо.

Вось-вось зялёны сад прачнецца...
Гляджу, як з цёплага галля, —
Ажно дрыжыць, увысь ірвецца
Вішнёвай завязі пчала.

Туды, дзе сонца жоўтым клінам
Прабіла неба навылёт,
Дзе цягнуцца уніз няспынна
Густыя промні, быццам мёд.

Валянціна Коўтун

Літаратурная пошта

Рафалу С. Калі першы раз убачыў Цябе на Сустрэчах „Зоркі" ў Нарве аўтар сатырычных тэксцікаў, адразу адчуў у Табе братнюю душу. Проста, звочыў у Тваіх смалістых вачах падобную іскрынку, якая штоpанак, калі ён брые свае ўсмешлівыя шчокі, адбліскваецца яму з люстэрка. І што б ён не пісаў, нават і лірычны нейкі твор, раптам убягае ў смешную каляіну. Гэтая іскарка досціпу ці сатыры, якія ўсё ж нейкім чынам „скрыўляюць" рэчаіснасць, неабходныя ў тым жанры, у лірыцы, бачыш, не на месцы. Хіба што аўтар прымяняе іх спецыяльна. А ў Тваіх новых вершах (усё ж не новых, бо ж мы іх, папраўдзе, ведаем — чыталі іх у „Ніве"!), нізачцы някепскай, якая аж іскрыцца ад таго досціпу — мо толькі ў „вершы аб каханні", які і, мабыць, належыцца чытаць „навыварат", той літаратурны прыём зразумелы. Думаю, што гэтым пакарыстаўся Ты свядома, як і несумненна свядома выслаў свае старыя новыя вершы ў рэдакцыю. А памятаем, бо чытаем! — таго і Табе, Рафал, жадаем: чытай добрыя вершы, неабавязкова свае!

Міра Лукша

Калі Дзень хлопца?

Рашэнне конкурсу з „Зоркі" н-р 11

У конкурсе, які аб'явілі мы з нагоды Свята жанчын, трэба было адказаць на пытанне: „Калі святкуем Свята мужчын?"

Задача паказалася не простай. Свята мужчын малавядомае, прытым, яны самі не надта вераць у яго існаванне. Вядома пра дзве даты: 1) 10 сакавік, 2) на свята Сарака мучанікаў (22 сакавіка).

Цікава, што ўсе адказы даслалі нам выключна дзяўчаты!

Узнагароды — кашулькі з мінулагодняга „Басовішча" — выйгралі: **Аня Раманюк** з Гайнаўкі і **Марта Каліноўская** з Беластока.

Віншуем!

Польска-беларуская крыжаванка № 17

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку н-р 13: Паток, нос, лазурак, пірог, рад, сон, кола, агарод. Ліса, тварог, зона, круг, народ, сокал, дар.

Узнагароды — фламастэры — выйгралі: **Пётр Герасімюк** з Арэшкава, **Наталля Каўшук** з Гайнаўкі, **Бася Анджаеўская**, **Паўліна Мялешка** і **Андрэй Шарэйка** з Дубін. Віншуем!

Гарадок спявае нам

Моцныя дзяўчаты — кіраўнічкі Ніна Цыванюк ды Ніна Мушынская

Прайшло ўжо 50 гадоў,
Нашы дзеці і ўнукі дарослыя ўжо,
А нам здаецца — учора ўсё было,
Як Ніна Мушынская і Жэня Савіцкая
гарадоцкі калектыў арганізавалі...
Ніна ЦЫВАНЮК

8 сакавіка ансамбль беларускай песні „Расспяваны Гарадок" адзначыў 50 гадоў свае дзейнасці. Праз „Расспяваны Гарадок" прайшло дзвесце асоб. Аб канцэртах, выступленнях і штодзённай рупнай працы гарадоцкіх самадзейнікаў можна напісаць кнігу. Яго заснавальніцамі былі Ніна Мушынская і Жэня Савіцкая, яе сястра, якая ў той час працавала бібліятэкаркай.

— Калектыў узнік у 1953 годзе, у той самы час, што „Зялёныя Курпі", але дзейнасць мы самі палічылі ад 1954 года. У маі таго года ў калектыў, калі мае сыны падраслі, прыйшла і я, — расказвае Ніна Цыванюк, наступная пасля Ніны Мушынскай кіраўнічка гурту. — У той час калектываў было мала, былі адно самадзейныя гурткі ў Шчытах, Пяньках ды Саколю. Спачатку мы не былі чыста беларускім ансамблем. Заапекавалася намі Ліга жанчын, Таварыства польска-савецкага сяброўства ТППР. На фестывалі моладзі і студэнтаў у Варшаве, дзе мы выступілі ад Беласточчыны, надзелі на нас такія строі, як у хоры Пятніцкага. Але калі ў 1956 годзе ўзнікла БГКТ, яно купіла нам беларускія строі. Так працавалі мы да 1967 года — самі, без спецыяліста. Самі песні развучалі. Мушынская стане, сама падырыгуе. Мікалай Праскураў дзвэнкне ў камертон... У 1967 г. прыйшоў у Гарадок Сцяпан Копа, як настаўнік, і стаў збіраць больш людзей, вярнуліся і тыя, хто па розных прычынах адышоў, да 25 асоб. Калі, пасля амаль 34 гадоў супрацоўніцтва, пакінуў нас Сцяпан, прыйшоў на дапамогу Віктар Маланчык.

Аліна Гобец, Ніна Харужая, Ірына Паўлючук, Галіна Ляховіч, Марыя Врублеўская, Анна Казбярук, Ніна Цыванюк на конкурсе фрывольнай песні ў Чорнай-Касцельнай

Ніна Мушынская мела вялікі арганізацыйны талент. У калектыў унесла важны творчы ўклад — тэксты песень, сцэнічныя апрацоўкі. Спачатку шыла нават калектыву сама касцюмы. Раней выступалі ў сціплых атласавых, пасля адна жанчына з Меляшкоў наткала палатна, з якога пашылі кашулі і спадніцы.

Цераз ансамбль перавінуліся такія індывідуальнасці, як удзельнік бітвы пад Монтэ-Касіна Юрка Налівайка, вядомы пасля як і саліст, настаўнікі Мікалай Ваўранюк, Сцяпан Зянюк, Мікола Лебядзінскі са Страшава, Аляксандр Ясюковіч, цяпер святар і кіраўнік іканапіснай школы ў ЗША. Трывалы след пакінулі такія асобы як Галена Кот, Раіса Дыль-

„Расспяванаму Гарадку"

Ужо паўвека праляцела,
Не агледзеўшы калі.
Гэта толькі год прапелі
Нашы слаўны песняры.

Пяцьдзесят год — гэта многа,
А прайшло нібы гадок.
Так пачаў ад маладога
„Расспяваны Гарадок".

Вы спявайце мовай роднай,
Каб культуру зберагаць,
Словамі і песняй звонкай
Сваю зямлю ўсхваляць.

Пабывалі за граніцай,
У Польшчы ўздоўж і ўпапярок
Гэта нашыя пявіцы —
„Расспяваны Гарадок".

Хай наступнае паўвечча
Узмацняе ваш гурток,
Няхай славіцца па свеце
„Расспяваны Гарадок".

Хай вам сонца не заходзіць,
Удзень і ўночы хай зіхціць,
А здароўе ўзнагародзіць,
Каб сто год маглі пражыць.

Ян Федзюкевіч

Віктар Стахвюк на Універсітэце

Быць паэтам

„Яго паэзія багатая сувязямі, канкрэтна тым, што не вызначаецца словамі і грунтуецца на любові да Айчыны. А своеасаблівае прароцтва і вычуванне тайнасці свету захапляе чытачоў", — так аб паэзіі Віктара Стахвюка сказала 18 сакавіка прафесар Галіна Тварановіч, арганізатарка ўжо трэцяга па чарзе спаткання студэнтаў з „белавежцамі".

Вітаючыся са студэнтамі Віктар Стахвюк адразу зазначыў, што „18 гадоў не сустракаўся з моладдзю, хаця раней працаваў са студэнтамі, але, як гэта ў жыцці бывае, нешта выпалілася і пакінуў інстытут". Аднак боязь паэта аказалася неабгрунтаванай. Не мінула пяць хвілін, а ўся зала з увагай слухала ўспаміны „белавежца" з паездак у Грэцыю, Італію, на Балканы, аглядала здымкі ў кніжках, прысвечаных гэтым падарожжам. Бо, як сам аб сабе гаворыць паэт, „я — чалавек неспакойнай душы". Віктар Стахвюк — паэт, вадалаз, графік, а цяпер і селянін, цікавіцца гісторыяй свайго роду, які вялікай каштоўнасцю лічыць сваё падляшскае паходжанне. Ён — асоба надзелена пазітыўнай энергіяй, якая выяўляецца ва ўсмешцы, жэстах, адкрытасці, падыходзе да людзей, што ўплывае і на ўспрыманне яго моладдзю.

Прачытаўшы некалькі вершаў са свайго зборніка „Багровы цень", паэт так гаварыў пра творчы працэс і паўставанне сваіх вершаў: „Быць паэтам я ніколі не думаў, але калі я быў у шостым класе, у школу завітаў Віктар Швед. Пад яго ўплывам я сеў і напісаў верш! Потым наступныя вершы траплялі ў насценгазетку, а пазней пісаў я для сябе. А вершы паўставалі ў розных месцах! Пісаў я ў рэстаранах на папяровых сурвэтках і не думаў ніколі аб іх публікацыі. І так было б цэлае жыццё, каб не сустрэча з Янам Чыквіным, які заахвоціў мяне да далейшай працы. Не мінула два гады і ён не прапусціў! Мае вершы выйшлі друкам".

Паэта інспіруе само жыццё, чаго адлюстраванне бачым у вершах, якія паўстаюць пад уплывам імпульсаў, бо, як сам гаворыць, „я не пішу так, каб сесці, спакойна вызначыўшы нейкую мэту. Я многа езджу, не слухаючы радыё, і раптам — думка, вобраз перад вачыма! Стаю і запісваю на кавалачку паперы! А вярнуўшыся дадому, спакойна ўспамінаю і вобразы пераходзяць у вершы".

Космас, рэлігія, каханне і падарожжы — гэта толькі некаторыя з тэмаў, якія закраналіся Віктарам Стахвюком у час спаткання са студэнтамі.

Паўтарагадзінная сустрэча праміну-ла маланкава, што не спадабалася студэнтам, якія на канец выгукнулі: „Ужо канееец???" і ўзнагародзілі паэта гарачымі апладысментамі. Пасля на калідоры я пачула: „Але фацэт! Шкада, што быў так коратка!" Гэта, на маю думку, найлепшая ацэнка паэту.

Паўліна Шафран-Асташэвіч

Шаноўная рэдакцыя!

Здаўна цікавіць мяне пытанне паходжання славян. Даволі многа ведаў я пра вялікае перасяленне народаў на пераломе VI і VII стагоддзяў, але адназначнага адказу на пытанне адкуль вырушылі ў Еўропу нашы продкі нідзе я не знайшоў. Польскія, расійскія і іншыя палітычныя тэорыі, фармуляваныя дзеля вузкіх палітычных мэтаў, паказаліся мне моцна падазронымі. Асабліва фальшывымі падаліся мне яны з прычыны адсутнасці ў іх месца для беларускага народа, яго мовы і культуры. Ва ўсіх гэтых польскіх і расійскіх тэорыях асабліва продкі беларусаў быццам бы не існавалі. Сёння ведаю, што яны фармуляваліся на палітычны ўжытак і мелі апраўдаць каланізацыйную палітыку палякаў і расіян на Беларусі.

Цяперашнія гістарычныя даследаванні паказваюць, што заселеная праславянамі тэрыторыя распаложаная была ў басейне сярэдняга Дняпра, прыблізна на сённяшнім беларуска-ўкраінскім памежжы. Калі так, дык іншыя славянскія народы, у тым ліку палякі і расіяне, сфармаваліся па-за праславянскай тэрыторыяй. А беларускі і часткова ўкраінскі народы паўсталі на гэтай тэрыторыі. З гэтага вынікае, што беларусы ўвабралі ў сябе найбольш праславянскага субстрату. Беларускі народ — найбольш славянскі з усіх народаў, паколькі яны ў найменшай ступені сутыкнуліся з вонкавым светам, можа, апрача балтаў. Развіваўся ён натуральным чынам, безупынна, займаючы старажытную тую ж самую тэрыторыю. Гэтае развіццё, на жаль, стараліся разбурыць палякі і расіяне, прапагандуючы свае фальшывыя тэорыі.

У святле даследаванняў і гістарычных фактаў няма абгрунтавання для аспрэчвання статусу самастойнасці беларускай мовы, што, на жаль, мае месца. Калі продкі сённяшніх беларусаў у сваёй асноўнай масе пражывалі на сваёй тэрыторыі, таму стварылі сваю мову на аснове нескажонай вонкавымі ўплывамі праславянскай мовы. Мабыць, праславяне размаўлялі на падобнай мове, як сённяшнія беларусы. Беларуская мова — гэта мова аўтахтонная, а не дыялект польскай або рускай моў.

Такім чынам беларусы — непасрэдныя патомкі і спадчыннікі карэннага аўтахтоннага праславянскага насельніцтва. Са старажытнасці звязаны яны са сваёй зямлёй і застаюцца ёй вернымі. Тыя, што абараняюць беларускую мову і культуру, абараняюць таксама нашы славянскія карані.

Мне трэба яшчэ даведацца аб продках беларусаў, асеўшых у Македоніі, бо гэта ж іх мова была запісана Кірылам і Мяфодзіем.

Можа пішу аб справах вядомых рэдакцыі, але для мяне яны новыя. У нашым польскім грамадстве — думаю, што ў беларускім таксама — свядомасць аб арыгінальнасці і непаўторнасці беларускай культуры, на жаль, невялікая. Для існавання нацыі свядомасць уласных каранёў — справа неабходная.

Я — карэнны паляк. Хаця не пішу па-беларуску, але чытаю. На жаль, не маю з кім размаўляць на беларускай мове, а так, мабыць, навучыўся б. „Ніву" стараюся чытаць па меры магчымасці рэгулярна, хаця не стае ёй дынамізму. Чытаю таксама іншыя выданні на беларускай мове.

Здзіслаў Ліпскі

ужо 50 гадоў

ко, Вольга Мядзведзева, Надзея Парэмбская, Ніна Лапінская, Ірына Свентахоўская, Галіна Паплаўская, Марыя Салагуба. Са старога складу да сёння спяваюць ды выступаюць Ніна Цыванюк і Ірына Паўлючук, з крыху пазнейшых — Тамара Бурачэўская. Сорак асоб, членаў ансамбля, ужо адышлі назаўсёды.

— У першыя гады нашага існавання праца ў калектыве выглядала інакш чым пазней, — успамінае спадарыня Ніна. — Выступаць мы ездзілі конным возам альбо трактарам, цягнікам. Асталіся ўспаміны, хвалюючыя, часам смешныя, як той, як мы дабіраліся дахаты пасля выступлення ў Міхалове з п'есай „Без віны вінавата" на платформе воза ад хлеба спадара Івана Майсака, і лопнула кола... У 1957 годзе ў нечаканы спосаб замардавалі нам харыстку Рэгіну Гутнік, адзіную каталічку сярод праваслаўных жанчын у калектыве (помнік па ёй паставіла БГКТ). Гэта паўплывала на тое, што шмат асоб пакінула калектыў. Калі неяк удалося нам узмоцніць яго, сталі мы ставіць і п'есы — „Мікітаў лапаць", „Валодзін гальштук", „Без віны вінавата", „Прымакі", „Паўлінку"... Паказвалі абрады — дажынкі, Купалле, капанне бульбы, вітанне вясны, бяленне палатна, вяселле, хрысціны, Каляды, Вялікдзень, Багаты вечар, вечар варожбаў, валачобнікі, абразкі з жыцця беларускай вёскі. Былі радасць і гора, у ансамблі, як у сям'і.

Гарадоцкі ансамбль прадстаўляў не толькі сваю гміну і тадышняе Беластоцкае ваяводства, але і ўсю беларускую меншасць у Польшчы. З канцэртамі з'ездзілі ўсю краіну. З вянком і песняй выступалі на цэнтральных польскіх мерапрыемствах —дажынках. Былі м.ішн. у Вэнгажэве, Казімежу над Віслай, Вэнграве. Стартавалі ў агульнапольскім аглядзе калектываў нацыянальных меншасцей, на прэзентацыях народных традыцый і сучаснай народнай творчасці, агульнапольскім фестывалі „Вясельная бяседа", Агульнапольскіх прэзентацыях культуры нацыянальных меншасцей у Польшчы ў Мельніку, Дабрыдзені, Млынарах, Мрангове, на Сувальскім кірмашы фальклору ў Вэнгажэве (спецыяльнае вылучэнне за творчы працяг фальклору і яго папулярызацыю), прымалі ўдзел у фестывалі „Еўропа без межаў", шмат разоў выступалі з індывідуальнымі канцэртамі. Выступалі і ў Беларусі — у Пінску, Мінску, Гродне, Мядзеле, Бераставіцы. За сваю шматгадовую размаітую дзейнасць „Расспяваны Гарадок" атрымаў калектыўную адзнаку „Заслужаны дзеяч культуры" і залатую „Заслужаны для Беласточчыны".

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Тамара Бурачэўская

Дзякуючы Сцяпану Копу калектыў варухнуўся наперад. З Юркам Налівайкам

У дзевяностыя гады шмат памагла свайму гміннаму гонару і Гарадоцкая гміна, фундуючы новыя строі. Славуты тутэйшы мастак, вядомы ва ўсім свеце Лявон Тарасэвіч сфінансаваў „Расспяванаму Гарадку" плакат, буклет, а нават боты.

У 1999 г. наступіў быў у калектыве крызіс, які давёў да таго, што ў хоры засталося толькі пяць асоб, а спадарыня Ніна, як кажа, моцна прыхварэла на сэрца (перайшла аперацыю, у якой прышчапілі by-passy).

— Перад тым, як я паклалася ў шпіталь, напісала сяброўкам: „Калі хочаце, каб я засталася жывая, зрабіце ўсё магчымае і немагчымае, і выступіце на Фестывалі беларускай песні". Дзяўчаты мабілізаваліся, згуртаваліся, выступілі і занялі першае месца.

Ад нядаўна ў „Гарадка" — новыя касцюмы, што спрэзентаваў ім гродзенскі ваявода. Добрыя адносіны да калектыву, які расслаўляе не толькі сваю старонку, заўважаецца і ў сённяшняе гміннае ўлады.

У апошні час за адным махам, у адзін дзень, калектыў заваяваў першыя месцы на ваяводскім аглядзе абрадавых калектываў у Ломжы ды на сёлетнім Фестывалі „Беларуская песня 2004" у катэгорыі вакальна-музычных ансамбляў, узнагароджаны былі і Ніна Цыванюк (аўтэнтычная народная песня), Марыя Врублеўская (апрацаваная песня) ды дуэт Ірына Паўлючук і Ніна Харужая (апрацаваная песня).

— Цяпер толькі мару, каб у калектыў прыйшлі маладыя асобы, — усміхаецца Ніна Цыванюк.

Міра Лукша
Фота з архіва

ПУР меў іншую канцэпцыю. У яго планах было стварэнне над мяжой зоны польскага асадніцтва. Таму, калі толькі нехта з беларусаў пакідаў сваю вёску, адразу туды пасылалі асадніка з Віленшчыны ці з Беларусі...

Змаганне за Беласточчыну

Пасля вайны на Беласточчыне пражывала каля 150 тысяч праваслаўных беларусаў. Беларускай мовай карысталася значна больш католікаў, але яны часцей дэманстравалі крайнія формы польскага нацыяналізму. Таму пра беларускую нацыянальнасць можна разважаць абмяжоўваючыся да праваслаўнага асяроддзя.

У верасні 1944 года савецкім бокам прынята было рашэнне аб перасяленні палякаў з Беларусі ў Польшчу і беларусаў з Польшчы ў Беларусь. Адпаведнае пагадненне было падпісана ўрадам БССР і Польскім камітэтам нацыянальнага вызвалення. Неўзабаве саветы зарыентаваліся аднак, што рэалізацыя пагаднення можа прынесці дэмаграфічныя затраты велічынёю ў 300 тысяч людзей. Палякаў у Беларусі налічылі звыш паўмільёна. Таму перасяленні сталі тут добраахвотнымі, хаця савецкія камісары моцна заахвочвалі беларусаў да выезду ў Беларусь. З другога боку мяжы ўпершыню сталі пераконваць беларускамоўных католікаў, што яны ў сапраўднасці з'яўляюцца беларусамі.

З сакрэтнай карэспандэнцыі ваяводскіх адміністрацыйных і партыйных улад, адрасаванай урадавым структурам вынікае, што беларусы найчасцей уцякалі на ўсход са здамінаваных каталіцкім насельніцтвам гмін. Старшыня Надзвычайнай камісіі кантролю Ваяводскай нацыянальнай рады ў сваім рапарце па ходзе перасяленчых спраў пісаў: „Białorusini emigrowali z wiosek i gmin o przewadze ludności polskiej pod naciskiem band faszyzmu polskiego, penetrujących w okresie 1945-1946 tereny o ludności mieszanej, a mających swe bazy wyjściowe z osiedli zwarcie zamieszkałych przez ludność polską". Рапарт Куснерка паказваў, што з заходніх гмін Бельскага, Сакольскага і Беластоцкага паветаў на ўсход выехала каля 80 працэнтаў беларусаў. Там, дзе дамінавала беларускае насельніцтва, выязджалі толькі паасобныя сем'і, найчасцей ідэйных камуністаў.

Гаспадаркі выселеных беларусаў Дзяржаўнае праўленне па справах рэпатрыяцыі (Państwowy Urząd Repatriacyjny — PUR) раздавала палякам з Беларусі. З рапарта Куснерка вынікае, што рэпатрыянты з усходу ў большасці ўключыліся ў падпольную дзейнасць і былі ініцыятарамі шматлікіх брутальных акцый супраць мясцовага беларускага насельніцтва. Пастаянныя гвалты і рабункі прымушалі мясцовае праваслаўнае насельніцтва пакідаць зямлю сваіх продкаў. Большасць апынулася перад дылемай — ратаваць зямлю, ці сваё і сваёй сям'і жыццё. Такім чынам некаторыя рэпатрыянты за згодай чыноўнікаў ПУР маглі законна пашыраць свае новыя гаспадаркі. Прадстаўнікі ПУР імкнуліся перш за ўсё пасяляць рэпатрыянтаў ва ўсходніх гмінах, чым выклікалі канфлікт з дзяржаўнай адміністрацыяй. Мясцовыя партыйныя і адміністрацыйныя ўлады прыйшлі да вываду, што трэба даць магчымасць беларусам, якія не выехалі да канца 1946 г. жыць і працаваць на сваёй зямлі і стварыць ім умовы для хуткай асіміляцыі ў будучыні.

ПУР меў іншую канцэпцыю. У яго планах было стварэнне над мяжой зоны польскага асадніцтва. Таму, калі толькі нехта з беларусаў пакідаў сваю вёску, адразу туды пасылалі асадніка з Віленшчыны ці з Беларусі. Часта нехта з беларусаў выязджаў з-за невыносных сацыяльных умоў і адсутнасці якіх-небудзь перспектыў. Пакідаў дом і зямлю брату, а сам шукаў шчасця ў Савецкім Саюзе ці на захадзе Польшчы. ПУР на яго месца сяліў асадніка, ствараючы ўмовы для непазбежнага канфлікту. Адміністрацыйныя ўлады заклікалі тым часам пасылаць палякаў з усходу ў Элцкі, Алецкі, Галдапскі паветы, адкуль выселілі немцаў і тысячы гектараў зямлі звычайна пуставалі.

Умовы, у якіх апынуліся перасяленцы з усходу, заахвочвалі іх да падпольнай дзейнасці. Рэпатрыянты стварылі чарговыя групоўкі, якія яшчэ доўга тэрарызавалі мясцовае беларускае насельніцтва. У некаторых памежных вёсках, асабліва ў Беластоцкім і Сакольскім паветах, удалося падпольным групам гвалтам прымусіць мясцовае насельніцтва да эміграцыі на ўсход. Пакінутая зямля за згодай ПУР ішла на пашырэнне гаспадарак рэпатрыянтаў. Толькі ў палове 1947 г. па ініцыятыве мясцовых ваяводскіх улад пачалі абмяжоўваць гэтыя гаспадаркі да 12 гектараў, а зямлю, якая раней была ўласнасцю беларусаў, раздаваць іх сваякам і суседзям. Каб абмежаваць этнічны канфлікт, урад Польшчы рашуча загадаў пасылаць усіх рэпатрыянтаў на былыя нямецкія землі. У наступных дзесяцігоддзях зямлю ва ўсходніх гмінах, за якую ішло так заядляе змаганне, пакінулі і беларусы, і беларускамоўныя найчасцей рэпатрыянты-палякі.

Яўген Мірановіч

Сайт „малады”, але ведаў утрымлівае больш чым дастаткова...

www.slounik.org

Кожнаму з нас неаднойчы даводзілася звяртацца за дапамогай у слоўнікі, даведнікі ці энцыклапедыі. Чалавек усё жыццё сутыкаецца з нечым дагэтуль яму незнаёмым і невядомым. Тады і ўзнікае патрэба кансультацыі. Менавіта аб слоўніках сёння пойдзе гаворка, а дакладней аб сайце http://www.slounik.org.

Набраўшы гэты адрас, выйдзем на бела-сінюю старонку ў Інтэрнэце, якая мае загаловак „Энцыклапедыя электронная”. Адразу варта адзначыць, што гэты сайт не навінны, а менавіта даведніцка-інфармацыйны. І таму ягоныя абнаўленні адбываюцца толькі ў сувязі з выхадам у свет таго ці іншага даведніка, слоўніка або энцыклапедыі. А ўжо аб гэтых навуковых навінках можна дазнацца паглядзеўшы на левы бок галоўнай старонкі сайта. Літаральна апошнімі днямі там з’явіліся „Кароткі расійска-беларускі фізіялагічны слоўнік” і энцыклапедычны слоўнік „Беларуская міфалогія”.

Большасць слоўнікаў на сайце мае, так бы мовіць, руска-беларускую накіраванасць па розных галінах навукі, тэхнікі і культуры, але сустракаюцца на ім і англійска-беларускія ды, нават, лацінска-беларускія слоўнікі.

Калі націснуць на размешчанае побач са „Слоўнікамі” слова „Энцыклапедыя”, то лёгка выходзім на спіс энцыклапедычных даведнікаў, якія прыцягнулі ўвагу распрацоўшчыкаў сайта і з якімі яны, відаць, хацелі б нас пазнаёміць. А густ у іх, варта адзначыць, нядрэнны. Тут і „Драўляныя цэрквы Беласточчыны”, і „Асветнікі Беларусі”, і „Міфы Бацькаўшчыны”, а таксама шмат чаго іншага, што тычыцца Беларусі, прычым яшчэ на англійскай і рускай мовах.

Пададзеныя ўверсе галоўнай старонкі падзагалоўкі ў пэўным сэнсе дублююць цэнтральную яе частку. Але гэта тычыцца толькі ўжо згаданых „Слоўнікаў” і „Энцыклапедый”. Бо далей ідуць не менш цікавыя звесткі „Пра праект”. Тут стваральнікі сайта сцвярджаюць, што патрэба ў ім узнікла даўно, а праца распачалася яшчэ ў 2002 годзе камандай беларускай электроннай бібліятэкі „Беларуская палічка”. Сам жа сайт запрацаваў у лютым гэтага года. Варта прызнаць, што для такога „маладога” ўзросту ведаў ён утрымлівае больш чым дастаткова.

На гэтай жа старонцы аўтары і распрацоўшчыкі „Энцыклапедыі электроннай” распавядаюць аб сваіх планах і дасягненнях, запрашаюць да супрацоўніцтва мовазнаўцаў, праграмістаў, дызайнераў. Просяць аб банэрнай падтрымцы.

Далейшыя падзагалоўкі „Кантакт” і „Спасылкі” гавораць самі за сябе. Што тычыцца апошніх, то акрамя беларускіх інфармацыйных рэсурсаў таксама служаць крыніцамі англійскія, польскія і расійскія Інтэрнэт-парталы.

З правага боку галоўнай старонкі месцяцца так званыя „Артыкулы дня”. Зараз там „вісяць” біяграфічныя звесткі аб вядомых у Беларусі людзях.

Зразумела, даведніцкі сайт не мог бы абысціся без сваёй пошукавай сістэмы. А яна пабудавана вельмі цікава. У адпаведным радку можна не толькі набраць патрэбнае для адшукання слова праз клавіятуру свайго камп’ютэра, але і зрабіць гэта з дапамогай адмыслова размешчанага тут выяўлення. Трэба дадаць, што клавіятура сайта цалкам беларусізаваная, прычым не толькі ў кірыліцы, але і ў лацінцы. Такім чынам, па ёй можна нават вывучаць адпаведны алфавіт (зразумела, каму ў гэтым ёсць патрэба) беларускай мовы.

Ну, а тым, каго зацікавіў змест сайта, а асабліва наступныя яго абнаўленні, ёсць магчымасць падпісацца на іх.

Уладзімір Лапцэвіч

Беларускія спартсмены ад Хельсінкі да Афінаў

Беларусь, беларусы...

У гэтым выпуску агульнае падсумаванне беларускіх здабыткаў на летніх алімпіядах. Найперш пятнаццатка мацнейшых майстроў за паўстагоддзя (1952-2000 гады). Першая калонка — агульная колькасць заваяваных медалёў (А), другая — залатых (З), трэцяя — срэбных (С), чацвёртая — бронзавых (Б).

Беларускія майстры спорту	**А**	**З**	**С**	**Б**
Віталь Шчэрба (спартовая гімнастыка)	10	6	0	4
Нэлі Кім (спартовая гімнастыка)	6	5	1	0
Вольга Корбут (спартовая гімнастыка)	6	4	2	0
Алена Бялова (фехтаванне)	6	4	1	1
Святлана Багінская (спартовая гімнастыка)	5	3	1	1
Віктар Сідзяк (фехтаванне)	5	3	1	1
Аляксандр Раманькоў (фехтаванне)	5	1	2	2
Тацяна Самусенка (фехтаванне)	4	3	1	0
Сяргей Каплякоў плаванне)	4	2	2	0
Тамара Лазаковіч (спартовая гімнастыка)	4	1	1	2
Ігар Басінскі (кулявая стральба)	4	0	2	2
Аляксандр Мядзведзь (вольная барацьба)	3	3	0	0
Уладзімір Парфяновіч (веславанне на байдарках)	3	3	0	0
Ларыса Петрык (спартовая гімнастыка)	3	2	0	1
Кацярына Хадатовіч-Карстан (акадэм. веславанне)	3	2	0	1

У першую дзесятку ўваходзяць спрэс гімнасты ды фехтавальнікі. Толькі плыўцу Сяргею Каплякову ўдалося ўклініцца пасярод чэмпіёнаў памосту і мушкецёраў. Бясспрэчным і „вечным” падаецца першынство славутага Віталя Шчэрбы. Пераўзысці яго дасягненні ў будучыні маларэальна. З пералічаных лаўрэатаў працягваюць актыўныя выступы толькі двое — стралок Ігар Басінскі і вяслярка Кацярына Карстан маюць шанцы папоўніць сваю калекцыю на бліжэйшых гульнях у Афінах. Усяго ж прызёрамі летніх алімпійскіх гульняў за ўсю гісторыю былі 126 беларускіх атлетаў.

Наступная табліца адлюстроўвае колькасць беларускіх медалёў па ўсіх відах спорту. Усяго беларусы вызначыліся ў 22 дысцыплінах.

Від спорту	**А**	**З**	**С**	**Б**
Спартовая гімнастыка	37	22	7	8
Фехтаванне	27	12	9	6
Лёгкая атлетыка	24	4	11	9
Акадэмічнае веславанне	17	3	—	14
Веславанне на байдарках і каноэ	13	11	1	1
Кулявая стральба	12	3	3	6
Гандбол	9	8	1	—
Плаванне	8	3	3	2
Грэцка-рымская барацьба	8	2	3	3
Цяжкая атлетыка	7	4	1	2
Баскетбол	6	4	—	2
Вольная барацьба	6	3	2	1
Скачкі ў ваду	4	1	1	2
Веласпорт	2	2	—	—
Конны спорт	2	1	—	1
Мастацкая гімнастыка	2	—	2	—
Бокс	1	1	—	—
Стральба з лука	1	—	1	—
Тэніс	1	—	—	1
Футбол	1	—	—	1
Дзюдо	1	—	—	1
Пяцібор’е	1	—	—	1
Разам	190	84	45	61

Падрыхтаваў Уладзімір Хільмановіч

Пасябравалі

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Гімназісты з шасці школ Гайнаўскага павета і вучні з чатырох школ Пружанскага, Свіслацкага і Камянецкага раёнаў прынялі ўдзел у конкурсе ведаў „Давайце ўзаемна пазнаёмімся”, які адбыўся 22 і 23 сакавіка ў Гайнаўскім доме культуры. З ліку школьных каманд Гайнаўшчыны перамаглі гімназісты Комплексу школ у Чыжах, а сярод моладзі з Беларусі першае месца занялі вучні са школы ў Пружанах.

22 сакавіка для гасцей з Беларусі выступіла з мастацкай часткай моладзь Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы. У час конкурсных змаганняў гайнаўскім вучням трэба было прадставіць на плакаце свае ўражанні ад паездкі ў Беларусь і расказаць па-беларуску пра свае малюнкі. Пасля гімназісты спявалі беларускія песні і дэкламавалі беларускія вершы. Многа балаў можна было сабраць за адказы на пытанні, якія тычыліся Пружанскага, Свіслацкага і Камянецкага раёнаў.

Вучням з Беларусі трэба было расказаць пра Гайнаўскі павет. Моладзь, якая вучыцца ў беларускіх школах, дзе руская мова з’яўляецца толькі дадатковым прадметам, размаўляла па-беларуску. На польскай мове адказвалі тыя вучні, якія дадаткова вучацца польскай мове. Усе вучні карысталіся матэрыяламі пра мінулае і сённяшняе Гайнаўскага павета. Перамаглі вучні са школы ў Пружанах. Другое месца занялі школьнікі з Пелішча, а трэцяе — з Поразава.

— У нас усім прадметам вучымся на беларускай мове і лічым гэта нармальным. Частка вучняў між сабой размаўляе на беларускай мове. Дадаткова выкладаюцца руская мова і літаратура, польская і англійская мовы. Тыя што вучацца польскай мове, могуць паступаць у вышэйшыя навучальныя ўстановы ў Польшчы, — заявілі Марына Кіслая, Марына Лісецкая і Оля Пузыр з Сярэдняй школы ў Свіслачы.

Змаганні за І месца сярод гімназістаў Гайнаўскага павета вяліся амаль да канца спаборніцтваў. Перамаглі гімназісты Комплексу школ у Чыжах. Другое месца занялі вучні Гімназіі н-р 2 у Гайнаўцы, а трэцяе — гімназісты са школ у Дубінах і Нараўцы. Белгімназісты з Гайнаўкі вельмі добра падрыхтавалі мастацкія выступленні, але страцілі балы ў час вусных адказаў і ў выніку занялі толькі чацвёртае месца.

— Падабаецца мне гэты турнір, дзе мы спаборнічалі па-сяброўску. Мне найбольш цікавымі былі конкурс па ведах і дэкламацыя верша, — сказала Аня Адамюк з Гімназіі ў Чыжах. Амелія Горбач дабавіла, што некаторыя вучні з Беларусі і Польшчы ўспелі пасябраваць.

— Мы ведалі, што 40% балаў у турніры прадбачаны за веды. Рыхтуючыся да конкурсу, мы вывучалі гісторыю і геаграфію прыгранічных раёнаў. Да мастацкага конкурсу стараліся падрыхтавацца крыху жартоўна, бо вучні мусяць таксама гуляць. Аднак трэба было нам, настаўнікам, многа напрацавацца. Амаль усе матэрыялы, па якіх вучыліся вучні, трэба было тлумачыць з рускай мовы на беларускую. У розных даведніках былі розныя інфармацыі і мы мусілі даходзіць да крыніц і выпраўляць памылкі, — кажа Вера Флёрчук, настаўніца беларускай мовы Гімназіі ў Чыжах.

Мерапрыемства арганізаванае было ў рамках праекта „Давайце ўзаемна пазнаёмімся — культурная адукацыя польскай і беларускай моладзі ў рэгіёне Белавежскай пушчы”, які рэалізавала Гайнаўскае староства ў супрацоўніцтве з беларускімі чыноўнікамі. Праект фінансаваны быў Нацыянальнай праграмай PHARE 2001 і Фондам малых праектаў, якім упраўляе Еўрарэгіён „Нёман”.

— Галоўнай задачай праекта з’яўляецца стварэнне трывалага супрацоўніцтва паміж прыгранічнымі раёнамі і пашырэнне ідэі трансгранічных сустрэч на як найбольшую колькасць моладзі, — заявіў Павел Крайнік з Гайнаўскага староства. Для пераможцаў з Чыжоў і Пружан будзе арганізавана экскурсія па Польшчы.

Аляксей Мароз

ШАФРАН ДЫ ПЕРАЦ

Чабурэкі

Прапорцыя на чатыры асобы: $^1/_2$ літра вады, 700 г мукі, 1 шклянка расліннага алею, соль, перац да смаку. На фарш патрабуем: 300 г сушаных грыбоў, 200 г квашанай капусты, тры цыбулі і адну вялікую моркву.

Выкананне: Да вады дадаць соль, чорны перац і прасеяную муку, замясіць цеста, якое павінна быць пластычным. Адвараныя грыбы разам з квашанай капустай, пакроенай цыбуляй і сцёртай морквай падсмажваем. На пасыпанай мукой кухоннай дошцы раскатваем тонкія кружкі дыяметрам у 20 см. На адзін бок кожнага кружка класці невялікую порцыю фаршу, а другім накрыць. Старанна зляпіць бокі чабурэка і ў некалькіх месцах накалоць відэльцам. Смажыць у алеі на невялікім агні. Можна падаваць з салатам.

Паштэт у цесце

Прапорцыя на 12 асоб: На цеста патрабуем 600 г мукі, 300 г сметанковага масла, 1 яйка, лыжачку солі, а на фарш: 200 г карэйкі, тры лыжачкі пасечанай свежай зялёнай пятрушкі, 700 г сасісак, масла, цёртую булку для пасыпання формы, 1 яйка.

Выкананне: Муку, сметанковае масла, яйка, соль і 100 мілілітраў вады пасячы нажом і вырабіць цеста, якое, загарнуўшы ў фольгу, пакласці ў халадзільнік на гадзіну. Карэйку пакроіць у костачку, а сасіскі змалоць у мясарубцы. Масу старанна вымяшаць з пятрушкай. Форму пашмараваць маслам, высыпаць цёртай булкай. Паміж двума лістамі пергаменту развалкаваць 2/3 часткі халоднага цеста і пералажыць яго ў форму. У сярэдзіну пакласці фарш, зраўняць берагі, якія трэба пашмараваць збітым „на пух" яйкам. Рэшту цеста таксама развалкаваць і дакладна прыкрыць верх. Каб цеста прыгожа зарумянілася, пашмараваць яго яйкам. Пячы гадзіну ў духоўцы ў тэмпературы 180 градусаў. Падаваць з бульбай і салатам.

Сыравы торт

Прапорцыя на 12 асоб: 200 г мукі, лыжачка парашку для пячэння, 3 яйкі, 150 г цукру, 200 г сметанковага масла, банку персікаў у соку, 2 лыжкі цёртай булкі, 500 г тварагу тройчы змеленага, лыжка лімоннага соку, пачка малочнага кісялю, шклянка малака, 10 пасечаных арэхаў для пасыпкі.

Выкананне: Муку, парашок для пячэння, палову цукру, адно яйка і 100 г масла вырабіць на гладкую масу. Авінуўшы ў фольгу пакласці на гадзіну ў халадзільнік. Персікі, выняўшы з соку, пакроіць у костку, пакінуць дзве цэлыя штукі для дэкарацыі. У пашмараваную тлушчам форму пакласці палову цеста, дакладна даціскаючы да берагоў. Відэльцам накалоць у некалькіх месцах. Пасыпаць цёртай булкай. Тварог сцерці з 2 жаўткамі, рэштай цукру, лімонным сокам і малочным кісялём. Мяшаючы, дадаваць паволі малако і рэшту стопленага масла. Масу спалучыць з узбітай пенай з бялкоў і пакроенымі персікамі. Пячы 40 мінут у тэмпературы 200 градусаў. Астылае цеста аздобіць кавалкамі персікаў, пакрапіць сокам.

Баба з макам

Прапорцыя на 18 асоб: 200 г марцыпанавай масы, 250 г сметанковага масла, 200 г цукру, 1 ванільны цукар, соль, 6 яек, 500 г мукі, парашок для пячэння, 150 мілілітраў малака, 200 г молатага маку, 2 лыжкі цукровай пудры, масла і мука для формы.

Выкананне: Масла, цукар і ванільны цукар сцерці на гладкую масу разам з дробна сцертым марцыпанам і шчопцем солі. Дадаць яйкі, старанна вырабляючы цеста. Муку спалучыць з парашком для пячэння і наперамен, разам з малаком, дадаваць да гібанага цеста. Падзяліць цеста на 2 часткі. Да адной дадаць мак і рэшту малака. Форму змазаць маслам і пасыпаць мукой. Пакласці светлае, а потым цёмнае цеста. Уставіць форму ў нагрэтую духоўку і пячы 70 мінут у тэмпературы 175 градусаў. Астудзіць і пасыпаць цукровай пудрай.

Смачна есці!

Паўліна Шафран-Асташэвіч

Новы будынак пасольства РБ

З 16 красавіка 2004 года Пасольства Беларусі ў Польшчы працуе ў новым будынку, які ў снежні мінулага года Рэспубліка Беларусь набыла ва ўласнасць.

Новая сядзіба Пасольства знаходзіцца на вуліцы Вяртнічай, 58, у адным з найбольш прэстыжных раёнаў сталіцы Польшчы — Вілянаў, на так званым „каралеўскім шляху", які спалучае былую летнюю рэзідэнцыю польскіх каралёў і Стары горад Варшавы.

Гэты сучасны будынак збудавала вядомае ў Польшчы будаўнічае Акцыянернае таварыства са шведскім капіталам „Эксбуд Сканска". Пры ўзвядзенні гмаху выкарыстаны навейшыя архітэктурныя, тэхнічныя і будаўнічыя рашэнні.

Фірмай „Эксбуд Сканска" выкананы па ўзгадненню з Пасольствам неабходныя адаптацыйныя работы, адпаведным чынам абсталяваны памяшканні консульскага аддзела.

Новы адрас Пасольства Беларусі ў Польшчы:

ul. Wiertnicza 58
02-952 Warszawa
tel. (22) 742 09 90
fax: (22) 742 09 80
e-mail:polan@belembassy.org
сайт: www.belembassy.org/poland

Прэс-служба Пасольства РБ

Вялікае беспрацоўе ў нашым рэгіёне давяло да сітуацыі, што амаль кожны з нас мае сярод сваіх сямейнікаў ці знаёмых асоб, якія шукаюць працу. Каб неяк памагчы такім людзям, адкрываем рубрыку „Дапамагаем з «Нівай»". Побач бясплатна будзем змяшчаць аб'явы людзей, якія шукаюць працу або могуць даць працу. Сардэчна запрашаем усіх чытачоў дасылаць у рэдакцыю свае прапановы. Рубрыку вядзе Паўліна Шафран-Асташэвіч, з якой можна кантактавацца па мабільніку нумар 0600 635 425 (або ў рэдакцыі па панядзелках ад 10 да 12 — тэл. 743 50 22).

ШУКАЮ ПРАЦУ

• Маладая жанчына, вышэйшая педагагічная адукацыя, абслуга камп'ютэра, вопыт у працы ў бюро, шукае працу ў Беластоку (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0503 713 915.

• Мужчына, 31 гадоў, правы кат. В, вопыт у будаўнічых працах, тэл. 651 09 80.

• Мужчына, сярэдняя адукацыя, правы кат. В, абслуга камп'ютэра, тэл. 654 05 47.

• Маладая жанчына з вышэйшай эканамічнай адукацыяй, абслуга камп'ютэра, добрае веданне англійскай мовы, правы кат. В, вопыт у працы настаўніка, тэл. 0601 093 284.

• Студэнтка-завочніца шукае працу ў Беластоку, санітарны мінімум, кніжка здароўя, правы кат. В, добрае веданне нямецкай мовы (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0693 332 218.

• Малады мужчына, 28 гадоў, тэхнічная адукацыя, уласная грузавая машына, шукае працу ў Падляшскім ваяводстве, тэл. 0608 151 373.

• Пенсіянерка з вопытам у гандлі, санітарны мінімум, веданне фіскальнай касы, шукае працу ў Беластоку, тэл. 0501 668 457.

• Шукаю працу як кіраўнік, вялікі вопыт на пасадзе кіраўніка магазіна, правы кат. В, тэл. 0603 727 489.

• Бухгалтар з вопытам, правы кат. В, абслуга камп'ютэра, веданне фіскальнай касы, шукае працу ў Бельску, тэл. 0696 120 667.

• Пенсіянерка з вопытам у апецы над старэйшымі асобамі, сярэдняя адукацыя, добрае веданне нямецкай мовы, заапякуецца малымі дзяцьмі, тэл. 653 01 34.

• Жанчына, 49 гадоў, пільна патрабуе працы, ахвотна прыбярэ, смачна зварыць, тэл. 661 15 92.

• Студэнтка-завочніца заапякуецца дзіцём у ранніх гадзінах, добрае веданне англійскай мовы, абслуга камп'ютэра, без дрэнных схільнасцей, тэл. 0601 240 086.

• Маладая жанчына танна прыбярэ кватэру, памые вокны, смачна зварыць, тэл. 0501 081 637.

• Мужчына, пасля арміі, сярэдняя інфарматычная адукацыя, пільна шукае працу ў Беластоку, тэл. 0508 764 743.

• Сумленны мужчына, 32 гады, кніжка здароўя, правы кат. В, уласная машына, правы на аўтапрузчыкі, вопыт, тэл. 0605 358 382.

• Жанчына, 42 гады, шукае працу ў ваколіцах Старасельцаў, танна прыбярэ, зварыць, заапякуецца дзіцём або старэйшай асобай, тэл. 710 90 03.

• Абітурыентка маркетынгу і англістыкі шукае працу ў Беластоку, абслуга камп'ютэра, санітарны мінімум (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0608 885 261.

• Мужчына, 37 гадоў, механік з вопытам, шукае працу ў Бельску-Падляшскім, правы кат. В, С, тэл. 0604 960 657.

• Апякунка дзяцей, вопыт за мяжой, спакойная, без дрэнных схільнасцей, тэл. 0504 942 107.

• Студэнт шукае працу ў Беластоку, свая машына, правы кат. В, добрае веданне рускай і беларускай моў, абслуга камп'ютэра, шмат вольнага часу (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0606 431 022.

• Мужчына, 35 гадоў, сярэдняя адукацыя, 16 гадоў працаваў сталяром, вадзіцельскія правы кат. В, уласная машына, уласныя майстэрня і матэрыялы, шукае новых кліентаў, зацікаўленых апрацоўкай хат у драўніне, арганізацыяй забудовы панадворкаў, індывідуальны падыход да кожнага кліента, вялікі вопыт у царкоўным будаўніцтве, тэл. 730 33 89 (Бельск-Падляшскі).

Дапамагаем сабе ўзаемна

У Бельску: 730 20 06

• Удавец з двума сынамі ва ўзросце 12 і 15 гадоў патрабуе цёплага адзення для сыноў і старой мэблі.

• Сям'я патрабуе цёплых, зімовых куртак для дзяўчат ва ўзросце 10, 12 і 13 гадоў.

• Адзінокая маці, якая выхоўвае чацвёра дзяцей, патрабуе цёплага адзення для 7-, 9- і 12-гадовых хлопцаў і для 15-гадовай дачкі, пледаў і пасцелі.

• Сям'я, якая выхоўвае сямёра дзяцей, будзе ўдзячная за ўсякую дапамогу (адзенне, пасцель, старая мэбля).

У Беластоку: 732 01 86, 712 11 53

• Сям'я патрабуе старой мэблі, халадзільніка, пасцелі.

• Сям'я, якая выхоўвае шасцёра дзяцей, патрабуе пасцелі, старой меблі, адзення.

• Сям'я з дзесяці асоб патрабуе пледаў, пасцелі, цёплага адзення для дзяцей.

• Студэнткі другога курса філалогіі будуць удзячны за стары, але спраўны камп'ютэр, тэл. 662 70 36.

• Тры сям'і з Відава, што каля Бельска-Падляшскага, з ахвотай аддадуць зімовыя курткі, мужчынскія і жаночыя штаны, світэры, ды іншае нязнішчанае адзенне, тэл. 730 40 00.

• Аддам дзіцячае адзенне ў добрым стане, тэл. 745 44 84.

• Аддам тапчан-полку з шафкай, тэл. 651 80 20.

Сабрала Паўліна Шафран-Асташэвіч

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Nakład: 1 600 egz.
Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Сакратар рэд.: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na III kwartał 2004 r. upływa 5 czerwca 2004 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na III kwartał 2004 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,45 zł, a kwartalnie — 44,85 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

Вер — не вер…

Дарагі Астроне! Толькі што адсвяткавалі мы васьмідзесяцігоддзе маёй свякрухі, у гонар якой мы зрабілі вялікі прыём. У падарунак я купіла ёй прыгожую і вельмі модную вячэрнюю сукенку.

А праз некалькі дзён мне сніцца дзіўны сон. Быццам бы я выходжу замуж, але гэта ўжо мой другі шлюб. І, уяві сабе, я выходжу замуж за майго ж мужа! Я апранута ў стройную сукенку з бэжава-карычневых элементаў. Зусім падобная на тую, якую мы падарылі мужавай маці. Складаецца яна з трох частак: сукенка з жаржэту, а на гэта яшчэ доўгая блузка і жылетка. Усё празрыстае, вельмі прыгожае.

Ну, і чакай, Астроне, гэта яшчэ не ўсё. Не мінуў тыдзень, як паведамляюць нам, што свякруха паламала нагу. Я адразу падумала, што высніла гэту бяду. А як ты, Астроне, думаеш, ці сапраўды мой сон мог прадвяшчаць тое, што яна паламае нагу?

Альжбета

Альжбета! Ты добра меркавала. Ты выходзіла замуж у сне, а гэта абазначала б нейкую непрыемнасць або сварку. Усё ідзе ў напрамку твайго мужа. Чаму ты брала другі шлюб са сваім актуальным мужам? Бо непрыемнасць мела прыйсці з яго боку. Ну, і сталася. Яго маці паламала нагу. Абсалютна набліжае да ісціны тая сукенка, у якой ты брала шлюб. Ідэнтычная з тою, якую ты купіла свякрусе, яна накіроўвае на думку, што нешта магло здарыцца якраз з мужавай маці.

Альжбета, ты добра расчытала свой сон. Пэўна, чытала рубрыкі Астрона. Жадаю табе больш радасных сноў!

Астрон

Чытайма „Ніву”!

Чытайце, людзі, „Ніву”, шчыра, не ляніва. Ад сэрца і ад душы словам родным заўжды даражы. Можна яе выпісваць, як і купляць, і свае думкі ў рэдакцыю ў лістах высылаць. Так нараджаюцца карэспандэнты — гэта ёсць факт эвідэнтны. На анучы не шкадуем грашэй, што выходзіць намнога даражэй, як выпіска роднай газеты. Мо нам здаецца: у анучах і скупасці дойдзем да мэты?.. Знойдзем у ёй цікавыя каштоўныя весткі пра наш край родны — беларускі, палескі. Калі выдамо грошы на „Ніву” — не збяднеем, а духоўна, з гонарам, з абавязкам — узбагацеем. Каб не ўстыдна было сустрэць залаты юбілей „Нівы”, будзь беларусам — патрыётам, моцным, небаязлівым.

Мікалай Панфілюк

„Даўціпы”
Андрэя Гаўрылюка

— Апошнім часам працую ў чыне бібліятэкаркі, — гаворыць пажылая жанчына сяброўцы.

— А ў якой установе?

— Дома: выдаю дзецям свае ашчадныя кніжкі.

* * *

У час экзамену прафесар пытае студэнта:

— Ваша прозвішча?

— Кавальскі!

— А ад чаго вам так весела?

— Бо правільна адказаў на ваша першае пытанне!

Еўраяйкі S-XL

Пра еўрасаюзныя парадкі многа анекдотаў.

Натхненне для жартаў падкрунулі і СМІ, асабліва на Prima Aprilis. У гэты дзень пачуццё гумару лунала ва ўсіх адценнях, найбольш — у змрочных.

Народ з жахам прыняў звестку пра падатак за карыстанне грылем. Паводле крыніц, тэма апанавала канцылярыі і ўстановы.

— Мая шэфова цэлы дзень тэлефанавала па знаёмых і лямантавала: навошта яна падтрымоўвала тую „Унію”, — расказвае знаёмы. — І хоць былі сумненні, ніхто не адважыўся выказаць іх уголас. Большасць падтаквала і разам кляймавала Еўрасаюз. Вечарам, калі інфармацыю абвяргнулі ў галоўным выпуску „Навін”, усё супакоілася. Аднак на другі дзень ніхто не смяяўся, усе сядзелі стуліўшы вушы.

Таксама ў „Самаабароне” ўголас ніхто не смяецца з Рэнаты Бегер, якая паверыўшы ў двайніка Аляксандра Кваснеўскага, пачала кляйміць прэзідэнта ў Сейме.

Па вёсках найбольш смяюцца з пашпартоў для жывёлы і еўрамерак.

Расказвае Ніна С.:

— Прыехаў мой чалавек з Гайнаўкі, кінуў шапкай аб стол і закрычаў: катам пашпарты трэба! А ў нас чатыры коцікі. І ён не будзе па чыноўніках з-за катоў цёгацца. Астаецца адно — павесіць іх.

— Я і дзеці кінуліся ў плач, а муж смяецца аж за жывот схапіўся. Дурная, — кажа, — жарт такі ў гміне пачуў. Ну і смяяліся, цэлы Вялікдзень.

— Мой чалавек, — цягне аповед спадарыня Ніна, — яшчэ напалохаў мяне яйкамі. Кажа, што цяпер калі прынясеш іх з куратніка, трэба знакаваць згодна з еўрамеркай: S, M, L, XL!

— А навошта?!

— У выпадку кантролю!

На ўсякі выпадак спадарства С. не падало ў спісак палову курэй.

— А ў горадзе, то ўсё з тых бландзінак смяюцца, — азываецца муж Ніны С.:

— Кажуць, што як адна ўбачыла на таварах цану ў еўра, дык ўспляснула ў ладкі і закрычала: — A mówili, że wszystko zdrożeje!

На канец астаецца толькі прыгадаць імёны „ацалелых” коцікаў: Джэк, Пакемон, Буш і Арабэлька. **(гак)**

Музычныя навіны

Ужо гатовы чарговы альбом трыо „Тройца”. Загаловак трэцяга альбома каманды — „Сем”. Альбом будзе даступны ў траўні. Лідэр „Тройцы” Іван Кірчук (на здымку) працуе таксама над фолькспектаклем „Варажбіт”, які паказаны быў толькі раз год таму. Трыо „Тройца” лічаць самым вядомым беларускім гуртом у свеце. Музыкі прэзентуюць апрацаваныя фальклорныя песні запісаныя ў час этнаграфічных экспедыцый па беларускіх вёсках.

У Інтэрнэце прайшло галасаванне „Генералы айчыннага року”. Удзельнікі выбіралі надзейныя маладыя гурты, якія павінны выступіць у музычным фэсце з такім жа назовам. Паводле вынікаў у час канцэрта, які адбудзецца ў Мінску 25 красавіка выступяць: „Зніч”, „Б.Н.”, „Тэзаўрус”, „Куклы”, „Гарадзкія”, „Сьцяна”, „Partyzone”. Апытальнік з'явіўся таксама ў самым буйным музычным выданні „Музычная газета”. Як кажа ініцыятар акцыі Віталь Супрановіч (BMA Group) у час канцэрта гурты будуць прэзентаваць па дзве кампазіцыі.

Адзін з самых вядомых беларускіх гуртоў у былых краінах Савецкага Саюза, рускамоўны „Льяніс Трубецкой” запісаў некалькі песень на беларускай мове. Дыск пад назвай „Золотые яйцы” выходзіць адначасова на трох буйных лэйблах розных краін. Як кажа лідэр групы Міхалок, „мы і раней хацелі ставіць у альбом песні на белмове, але маскоўскія выдаўцы былі катэгарычна супраць”. Новы альбом „Залатыя яйкі” будзе трохмоўны. Апрача беларускіх, знойдуцца ў ім рускія ды ўкраінскія кампазіцыі.

Татка Стэп

Крыжаванка

1. месца нараджэння Васіля Петручука, 2. месца нараджэння касмічнага палёту, 3. месца нараджэння Аляксея Карпюка, 4. месца нараджэння Марка Шагала.

(ш)

Рашэнне крыжаванкі — асобу і месца яе нараджэння — складуць літары з упарадкаваных курсівам клетак.

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 11 нумара

Свіслач, Чаромха, Саколка, Нараўка, Юхнавец, Мельнік, Гарадок.



Рашэнне: **Сакавік.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Мікалаю Калішу** з Парцава і **Лявону Федаруку** з Рыбалаў.

25.04 – 1.05

Баран (21.03. — 19.04.) 25 — 27.04. — знакаміты час аформіць розныя дробныя справы. Усё пойдзе табе лёгка, будзеш дзейнічаць хутка і з поспехам. Выберыся ў падарожжа, можаш сустрэць там сваю палавінку. Азвецца пячонка — залішне сабе дагаджаеш.

Бык (20.04. — 20.05.) Карысны час для фінансаў, але зважай на пасткі. Найлепшы час задбаць аб важныя справы. Да 27.04. не бяры нічога ў крэдыт.

Блізняты (21.05. — 21.06.) Да 26.04. аформіш цяжкія справы. Не лезь у даўгі. Лёгкі спад энергіі і меланхалічны настрой, тыповы для цябе ў гэтую пару года. Дробныя спрэчкі сярод партнёраў, якія змагаюцца адно з адным за перавагу. Будзе мір, мілая разрадка, вернецца гармонія.

Рак (22.06. — 22.07.) 28.04. падтрымка сяброў і ўмеласць канструктыўнага супрацоўніцтва. Справішся з усім, што патрабуе цярплівасці ды дакладнасці. 25.04. не разлічвай на тое, што табе падкажа інтуіцыя; будзеш глухі на яе падказкі і захочаш верыць адно свайму розуму.

Леў (23.07. — 22.08.) Да 27.04. час на новаўвядзенні ды арыгінальныя развязкі. Моцна хочаш сапраўднага пачуцця, якое магло б цябе перамяніць, але за гэтай вялікай патрэбай любові ідуць агромныя патрабаванні. Марыш, каб хтосьці табою ўладаў, але адначасова нікому не даеш сабою кіраваць. Пасля 24.04. гэты канфлікт яшчэ ўзрасце. Зоркі моцна падтрымаюць твае фінансы.

Дзева (23.08. — 22.09.) Добры час на любоўныя сустрэчы, паяднанні, размовы, якія патрабуюць тактоўнасці ды дыпламатыі. Абдумай стратэгію каб звярнуць на сябе ўвагу шэфа і… дамагайся павышэння зарплаты.

Шалі (23.09. — 23.10.) 30.04. спрыяльнае наладжанню новых кантактаў, разблытаеш адну загадку. Можаш аднак страціць шанц папраўіць свае памылкі. Устрымайся з рашэннямі, якія могуць паўплываць на тваю будучыню.

Скарпіён (24.10. — 21.11.) Справішся з „хвастамі”, а таксама абдумаеш важныя справы. Стратэгічныя рашэнні будуць лёгкія. Не рызыкуй. Шукай саюзнікаў. Прыбудзе грошай і эмоцый. Інвестыцыі адкладзі на пазней.

Стралец (22.11. — 21.12.) Перад табою новыя шанцы і магчымасці. Будзеш мець шчасце і шчаслівыя выпадкі. Не разлічвай на вялікі выйгрыш. Важныя фінансавыя рашэнні кансультуй з блізкімі.

Казярог (22.12. — 20.01.) 26 — 30.04. Паспяхова рэалізуеш свае мэты. Хопіць табе дысцыпліны ды стойкасці. Можаш лёгка кінуць курэнне.

Вадалей (21.01. — 19.02.) Да 27.04. будзеш ажыўлены, энергічны. Хатнія справы будуць мяняцца вельмі хутка. Новыя кантакты, што здаваліся вельмі ўражваць, будуць нявартыя мітрэнгі. Не спадзявайся, што толькі што пазнаная асоба гэта дарунак ад лёсу.

Рыбы 20.02. — 20.03.) Будзеш усё раздражнены, схільны да рызыкі. Хоць адчуеш, што цябе кахаюць ды паважаюць. Варта прызнаць рацыю найбліжэйшым ды не кіравацца фальшывым гонарам. Праца дасць шмат задавальнення. Рыбы народжаныя 20 — 27.02. — знайдзіце час на прыемны адпачынак.

Агата Арлянская

ISSN 0546-1960